

ЯК РЫХТУЮЦЬ ПАРАЛІМПІЙЦАЎ **4-5**

ДЫСКУСІЯ ДА 130-ГОДДЗЯ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА **12-13**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛЮТАГА 2023 г. СУБОТА № 33 (29913)

## КОРАТКА

- **COVID-19 выключылі з захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва.**
- Знішчэнне гнёздаў птушак у Беларусі забаронена з 16 лютага да 14 жніўня.
- **Кітайскія інвестары па выніках 2022 года накіравалі больш за $100 млн на праекты ў Беларусі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Сённяшнія выклікі эканоміцы — гэта не толькі абмежаванні, але і новыя магчымасці для развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці як саміх прадпрыемстваў, так і прадукцыі, якую яны выпускаюць. Адна з ключавых задач тут — рост прадукцыйнасці працы. Нашы даследаванні паказалі, што 60 працэнтаў прадукцыйнасці працы ў Беларусі забяспечана за кошт тэхналагічнага абнаўлення, 25 працэнтаў — аптымізацыі занятасці і павышэння ўзроўню кваліфікацыі кадраў і 15 працэнтаў прыросту — за кошт удасканалення арганізацыі вытворчасці, працы і кіравання. Як бачым, рост прадукцыйнасці працы ў беларускай эканоміцы падтрымліваецца галоўным чынам за кошт павышэння тэхналагічнага ўзроўню вытворчасці і ў многім залежыць ад дынамікі інвестыцый у стварэнне новых індустрый і рабочых месцаў. За апошнія чатыры гады на тэхналагічнае перааснашчэнне штогод накіроўвалася каля паловы ўсіх інвестыцый у асноўны капітал».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НАМ БУДЗЕ ШТО СКАЗАЦЬ НАРОДАМ БЕЛАРУСІ І РАСІІ НА ВЫШЭЙШЫМ ДЗЯРЖСАВЕЦЕ»

**Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна прайшла ў падмаскоўным Нова-Агарове. Кіраўнікі дзвюх дзяржаў абмеркавалі пытанні эканомікі, абароны і бяспекі, якія на сёння ў роўнай ступені важныя.**



Фота БелТА.

### МЫ ВЕДАЕМ, КУДЫ ІСЦІ І ШТО РАБІЦЬ

«Усё, аб чым мы дамаўляліся з вамі ў свой час, зусім нядаўна, месяцы тры таму, па абароне і бяспецы, беларускі бок 100 % выканаў па мінулым годзе. І нават больш», — сказаў Аляксандр Лукашэнка на пачатку сустрэчы.

Ёсць рух і ў мікраэлектроннай прамысловасці: «Мы перажывалі з вамі, што сапраўды недзе вельмі завязаныя былі на імпарт. Вось праз тыдзень у мяне якраз нарада ў тым ключы, пра што мы гаварылі ў Сочы з Вамі. Мы мікраэлектронную прамысловасць — тое, што было ў Саюзе, як Вы сказалі, — захавалі. З расіянамі дамовіліся — тымі кампаніямі, якія таксама ад Саюза засталіся. І сёння спецыялісты кажуць: «Не хвалюйцеся, перадайце Уладзіміру Уладзіміравічу, мы выканаем усё неабходнае». Ну, трошкі габарыты будуць большыя, але ў найбліжэйшы час... Мы ведаем, куды ісці і што рабіць. Гэта самае галоўнае. Людзі разумеюць».

«З імпартазамяшчэннем мы рушылі. Не скажу, што вырашылі ўсе пытанні, але рушылі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што па выніках 2022 года Расія і Беларусь маюць беспрэцэдэнтны абарот таварамі і паслугамі: «$50 млрд. Каля $44 млрд, як Вы сказалі, па таварах. І яшчэ паслугі».

**СТАР. 2**

Навука

# Ад верталёта да нанабетону

## Гомельшчына першая з рэгіёнаў прыняла выставу «Беларусь інтэлектуальная»

**Маштабная экспазіцыя дасягненняў айчыннай даследчай дзейнасці напярэдадні Дня беларускай навукі была прэзентавана ў Мінску. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, каб як мага больш людзей пазнаёміліся з унікальнымі беларускімі праектамі, выстава будзе арганізавана ва ўсіх абласных цэнтрах. Гомель прыняў яе першы. З навуковым патэнцыялам непасрэдна паўднёва-ўсходняга рэгіёна ў экспазіцыі «Беларусь інтэлектуальная» знаёміць 25 прадстаўнікоў. Сярод іх — ВНУ і навуковыя ўстановы, тэхнапарк «Карал», БМЗ, «Гомсельмаш», «СветлагорскХімвалакно» і шэраг іншых вядомых прадпрыемстваў рэгіёна.**



У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця выставы прыняў удзел старшыня аблвыканкама Іван Крупко, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Сяргей Барташ, намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Чыжык.

**СТАР. 2**

У цэнтры ўвагі

# ВЕДЫ ПЛЮС АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

## Сістэма адукацыі павінна абапірацца на дзяржаўныя інтарэсы



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Якасць адукацыі, эфектыўнасць выхаваўчай работы, важнасць прафарыентацыі і прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, суправаджэнне таленавітых дзяцей, аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі, пілотны праект па арганізацыі харчавання ў школьных сталовых — гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў калегіі Міністэрства адукацыі, на якой падводзіліся вынікі папярэдняга года і ўзгадняліся планы на будучыню.**

**СТАР. 7**

# «НАМ БУДЗЕ ШТО СКАЗАЦЬ НАРОДАМ БЕЛАРУСІ І РАСІІ НА ВЫШЭЙШЫМ ДЗЯРЖСАВЕЦЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Пасол мне па дарозе дакладваў, прыемна мяне здзівіла, што вашы кампаніі на больш за $ 300 млн замовілі ў нашых айцішнікаў прадукту. Заплацілі больш за $ 300 млн. Усе крычалі: «Вось, з Беларусі разбегліся, у Расіі сышлі і іншае...» Толькі ў Беларусі замовілі ў Расіі на 300 мільёнаў і заплацілі. А калі ўзяць айцішнікаў расійскіх — там некалькі мільярдаў долараў. Так што нават тут «міралюбівым» краінам не атрымалася нас так заціснуць, што лепшыя розумы, як яны казалі, збеглі з нашых краін. Значыць, імпартазамяшчэнне ўсё ж такі прасоўваецца», — сказаў Прэзідэнт.

Уладзімір Пуцін адзначыў, што ў Беларусі дзякуючы намаганням улад змаглі захаваць прадпрыемствы, створаныя яшчэ ў савецкія гады, і вывесці іх на новы ўзровень развіцця. «Вынікамі гэтага развіцця мы разам можам сёння скарыстацца. Больш за тое, аб'ядноўваючы намаганні, мы ствараем нейкую сінергію. З аднаго боку — вашы магчымасці ў сферы прамысловасці, з другога боку — патрэбы нашага рынку і дадатковыя намаганні з боку расійскіх прадпрыемстваў, інжынераў, нават навуковай школы. Усё гэта складваецца вельмі эфектыўна па некаторых галінах. Мы спадзяёмся на добры вынік як для Беларусі, так і для Расіі», — заявіў Прэзідэнт Расіі.

«Учора, дарэчы, глядзеў Вашу прэс-канферэнцыю. Я падзяляю Вашы пазіцыі і падыходы», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

## КЛЮЧАВЫЯ МОМАНТЫ ВЫРАШАНЫ

Аляксандр Лукашэнка на перагаворах паведаміў свайму расійскаму калегу, што саюзныя праграмы з Расіяй, якіх усяго налічваецца 28, ужо выкананы на 80 працэнтаў.

«Паглыбляемся, усё робім для таго, каб неяк пераадолець тыя бар'еры, якія нам штучна ствараюць. Я не гавару знарок аб харчаванні. Мы забяспечылі харчовую бяспеку. Не кажу пра тое, што людзі павінны быць апрануты. Мы гэта зрабілі па ўсіх напрамках. Таму становўчыя зрухі прыстойныя. Нам будзе што сказаць народам Беларусі і Расіі на Вышэйшым дзяржаўным савеце», — адзначыў беларускі лідар.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін, рэагуючы на сказанае, падкрэсліў: «Ну і не толькі сказаць, але, мне здаецца, і разам з калегамі намеціць шляхі далейшага развіцця».

«Абсалютна. 28 праграм, якія мы намецілі з вамі, пад 80 працэнтаў ужо выкананы, — сказаў у працяг тэмы Аляксандр Лукашэнка. — Але там, вы адзначалі гэта ў Піцеры, гуманітарныя (пытанні. — **«Зв.»**) у нас у асноўным засталіся. А вось мытныя, падатковыя — мы законы прынялі».

«Ключавыя моманты вырашаны», — пагадзіўся Прэзідэнт Расіі. «Так, ключавыя вырашаны», — пацвердзіў кіраўнік беларускай дзяржавы. Уладзімір Пуцін у сувязі з гэтым выказаў упэўненасць, што ўсё гэта, безумоўна, «будзе рабіць нашу эканоміку яшчэ больш канкурэнтаздольнай».

«Вы калісьці ў ЕўрАзЭС паставілі пытанне аб кааперацыі ў галіне авіябудавання. Дык вось я Вам павінен далажыць, што беларусы робяць для МС-21 (расійскі сярэднемагістральны вузкафюзеляжны пасажырскі самалёт. — **«Зв.»**) і Superjet 100 (расійскі блізкамагістральны вузкафюзеляжны пасажырскі самалёт. — **«Зв.»**). да тысячы камплектуючых. У нас тры заводы. Два ваенныя і адзін грамадзянскі. Яны раней былі рамонтнымі. Сёння ўжо выпрацоўваюць камплектуючыя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што ў Беларусі гатовы выйсці на вытворчасць самалёта Су-25 «пры адпаведнай невялікай тэхналагічнай падтрымцы Расійскай Федэрацыі».

Наладзілася супрацоўніцтва і паміж прадпрыемствамі, якія раней лічылі адно аднаго канкурэнтамі. Гэта, у прыватнасці, МАЗ і КАМАЗ. «У нас заўсёды, памятаеце, КАМАЗ, МАЗ — нейкая цяганіна была. А цяпер і канкурэнцыі ніякай. Мы выпускаем тавары для КАМАЗа — камплектуючыя, КАМАЗ робіць для нас. Калі сышлі асобныя кампаніі (заходнія. — **«Зв.»**), вось так працуюць. І рынку хапае», — канстатаваў беларускі Прэзідэнт.

Разам з тым, паводле яго слоў, яшчэ ёсць над чым працаваць. Пэўныя праблемныя моманты ёсць у пытаннях кааперацыі.

У парадку дня сустрэчы лідараў Беларусі і Расіі былі таксама пытанні ўмацавання Саюзнай дзяржавы, рэалізацыя саюзных праграм. «Яны адпрацаваны нашымі калегамі ва ўрадзе. Гэта стварае ўмовы, базу для таго, каб рухацца наперад па развіцці нашай кааперацыі, перш за ўсё, вядома, у эканамічнай сферы», — дадаў Уладзімір Пуцін.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

У працяг тэмы

# БЕЛАРУСЬ ДУМАЕ АБ МІРЫ

**Падчас размовы Прэзідэнта з замежнымі і беларускімі журналістамі, якая днямі незапланавана адбылася ў Палацы Незалежнасці, як заўсёды, з вуснаў кіраўніка дзяржавы прагучалі канцэптуальныя рэчы. Прадказальна, што найбольшая колькасць пытанняў, адрасаваных Аляксандру Лукашэнку, была звязана з канфліктам ва Украіне. І яшчэ больш прадказальна, што, адказваючы нават на самыя вострыя з іх, беларускі лідар казаў выключна аб міры.**

«Толькі мір!» — неаднаразова падкрэсліваў у гутарцы з прадстаўнікамі масмедыя Прэзідэнт. І прапаноўваў шляхі вырашэння гэтага канфлікту. У тым ліку Мінск гатовы даць пляцоўку для перагавораў прэзідэнтаў Расіі і Украіны. З мэтай вырашэння сітуацыі Аляксандр Лукашэнка запрасіў у Беларусь і Прэзідэнта ЗША. «Калі ў яго (Джо Байдэна. — **«Зв.»**) ёсць жаданне, мы яго ў Мінску гатовы прыняць і сур'ёзна пагаварыць, калі ён хоча міру ва Украіне, — заўважыў беларускі лідар. — І нават Пуцін прыляціць у Мінск. І сустрэнемся тут утрох: два «агрэсары» і «міралюбівы» прэзідэнт. Чаму не — для спынення вайны?»

Ужо не першы раз з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі на ўвесь свет прагучала, што Беларусь хоча міру і многае гатова зрабіць для гэтага. Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ,** запрашэнне Прэзідэнтам Беларусі Байдэна, які плануе наведаць Варшаву, прыехаць у Мінск і правесці перагаворы з Уладзімірам Пуціным па ўрэгуляванні ваеннай сітуацыі, у пэўным сэнсе было спробай зразумелым для грамадскасці і для журналістаў чынам паказаць, хто на самай справе з'яўляецца рэальным праціўнікам урэгулявання. «Так, Злучаныя Штаты Амерыкі, выкарыстоўваючы свае глабальныя сродкі масавай інфармацыі, пастаянна робяць укіды ў грамадскую прастору аб неабходнасці перагавораў і ўрэгулявання, аднак у рэальнасці менавіта адміністрацыя прэзідэнта ЗША з'яўляецца галоўнай перашкодай для правядзення гэтых перагавораў, — адзначыў парламентарый. — Яны (ЗША. — **«Зв.»**) не зацікаўлены ў міры і не хочуць урэгулявання. Яны хочуць працягваць гэтую вайну, выцягваючы рэсурсы Расіі. Менавіта для гэтага яны трэніруюць украінскіх вайскоўцаў, накіроўваючы туды тэхніку і, што, дарэчы, важна, дазваляюць сваім ваеннаслужачым ехаць ва Украіну і ўдзельнічаць у баявых дзеяннях у якасці наёмнікаў, салдат удачы. Менавіта яны зацягваюць гэты канфлікт і ствараюць умовы для таго, каб людзі пакутавалі».

Па меркаванні Андрэя Савіных, па гэтай прычыне такі візіт не адбудзецца. «Але Беларусь чарговы раз паказвае сваю прыхільнасць міру, паколькі мы не хочам ваяваць на чужой тэрыторыі і не будзем гэтага рабіць, — акцэнтаваў увагу дэпутат. — Пры гэтым нам не трэба нічога нікому даказваць. Мы заўсёды былі бокам, які выступае за ўрэгуляванне, заўсёды былі гатовы дапамагчы бакам канфлікту. І, Прэзідэнт гэта падкрэсліў, мы не можам прымаць за іх рашэнні, але калі ад нас нешта залежыць, мы заўсёды гэта зробім».

**Вераніка КАНЮТА.**

# Ад верталёта да нанабетону



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гомельская вобласць мае сур'ёзны навуковы тэхнічны сектар, які ўключае восем ВНУ, тры інстытуты Нацыянальнай акадэміі навук, больш як 20 галіновых інстытутаў і канструктарскіх бюро, у якіх задзейнічана каля трох тысяч навуковых супрацоўнікаў, — падкрэсліў **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО** высокі ўзровень навуковых распрацовак вучоных Гомельшчыны.

Кіраўнік рэгіёна выказаў упэўненасць, што за чатыры дні работы выставы яе наведвальнікі значна пашыраць свой кругагляд і адчуюць гонар за дасягненні навуковай думкі краіны.

— «Беларусь інтэлектуальная» — не толькі і не столькі навука. Гэта канчатковыя вынікі, якія ўвасоблены і на базе нашых прадпрыемстваў, што распрацоўваліся не толькі ў акадэмічных інстытутах, але і ва ўніверсітэтах, — звярнуў увагу падчас адкрыцця выставы **намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК.** Па яго словах, маштабная экспазіцыя пабудавана не па ведамствах, а па напрамках дзейнасці: штучны інтэлект, «Індустрыя 4.0», фармацэўтыка і медыцына, аграрны напрамак і іншыя.

Свае распрацоўкі на выставе прадстаўляюць і ўстановы дадатковай адукацыі навучэнцаў.

— Мы выставілі чатыры работы розных напрамкаў. Сярод іх — беспілотны лятальны апарат — прызёр абласнога этапу і ўдзельнік рэспубліканскага конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці «ТэхнаІнтэлект», дзе распрацоўка заняла першае месца. Корпус «беспілотніка» цалкам распрацаваны і зроблены рукамі нашага навучэнца. Яго ідэя — прымяненне ў хатняй гаспадарцы — заахвочванне прасунутых у тэхніцы падлеткаў летам дапамагаць палівацца, дагледзець агарод ці прысядзібны ўчастак, — расказала аб экспазіцыі Гомельскага абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі **загадчык аддзела інавацыйнай і тэхнічнай творчасці ўстановы Алена МАРТЫНАВА.**

У цэлым на выставе прадстаўлена звыш 600 экспанатаў, якія знаёмяць з айчыннымі распрацоўкамі ў сферах абараназдольнасці, энергетыкі, экалогіі, фармацыі, медыцыны, сельскай гаспадаркі, IT-тэхналогій і робататэхніцы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Наталля КАЧАНАВА:

# «Дзеці з аўтызмам мусяць і далей жыць у соцыуме, працаваць, ствараць сем'і»

**Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай прайшло чарговае пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Мерапрыемства было арганізавана на базе рэсурснага цэнтра ранняга ўмяшання для дзяцей ранняга ўзросту 19-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска.**

У абмеркаванні пытанняў узялі ўдзел міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч, міністр адукацыі Андрэй Іванец, міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Алена Богдан, члены Савета Рэспублікі, урачы і педагогі, спецыялісты па ранняй дыягностыцы і рэабілітацыі.

Наталля Качанава нагадала, што тэма трапіла ў поле зроку кіраўніцтва Савета Рэспублікі пасля зваротаў бацькоў дзяцей з асаблівасцямі, у прыватнасці з расстройствамі аўтыстычнага спектра. Ужо праведзена некалькі пасяджэнняў кансультатыўнага савета.

— З аднаго боку, дзяржава зрабіла ўсё, ствараючы такія рэабілітацыйныя цэнтры, дзе дзеці вучацца новым навыкам, праходзяць рэабілітацыю. Кодэкс аб адукацыі прадугледжвае інтэграцыйнае навучанне ў школе. Сем'ям, якія выхоўваюць такіх дзяцей, аказваецца ўсебаковая дапамога. Аднак разам з тым некаторыя бацькі сутыкаюцца з рознымі праблемамі на розных этапах, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна дадала, што колькасць дзяцей з аўтызмам павялічваецца, і гэта характэрна для многіх краін свету. Таму на гэту праблему нельга не звяртаць увагу.

— Гэта грамадзяне нашай краіны, якія і далей мусяць жыць у соцыуме, працаваць, ствараць сем'і, — падкрэсліла спікер Савета Рэспублікі. — Сёння мы наведалі ўстанову аховы здароўя, наступным разам паглядзім установу адукацыі, а далей будзем працаваць над тымі пытаннямі, якія з'яўляюцца ў бацькоў.

У 2022 годзе ў краіне працавала 50 цэнтраў ранняга ўмяшання: у Мінску — 7, у Брэсцкай вобласці — 15, у Віцебскай — 5 , у Гомельскай — 3, у Гродзенскай — 7, у Мінскай — 8, у Магілёўскай — 5. У пачатку 2023 года з'явіліся яшчэ тры: два — на базе дзіцячых паліклінік Мінска, адзін — на базе Гомельскага абласнога дома дзіцяці. Запланавана адкрыццё яшчэ 5 цэнтраў на базе цэнтральных раённых бальніц — Століна, Кобрына, Смаргоні, 14-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска і Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы.

**Алена КРАВЕЦ.**

*Працяг тэмы чытайце ў наступным выпуску «МС».*

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Аляксандру Вікенцьевічу Дараховічу, першаму намесніку міністра спорту і турызму, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

З нагоды

# ЗАЛАТЫ ФОНД ВІЦЕБШЧЫНЫ

**Учора ў паўночным рэгіёне прайшла ўрачыстая цырымонія, прысвечаная 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці і ўшанаванню лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны — 2022».**



У Прыдзвінні здаўна склалася добрая традыцыя ўшаноўваць людзей, якія дабіліся найлепшых вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці і ўнеслі важкі ўклад у развіццё вобласці. Штогадовая цырымонія прысуджэння звання «Чалавек года Віцебшчыны» — гэта даніна павагі шматгадовай і ўпартай працы на карысць арганізацыі або прадпрыемства, з поспехаў якіх складваецца мазаіка дасягненняў усяго рэгіёна.

Урачыстае мерапрыемства прайшло ў двайной атмасферы свята: вобласць адзначае 85-годдзе. Віншавальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі зачытаў прысутным намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Ермаловіч: «Дарагія жыхары Віцебшчыны, сардэчна віншую вас з 85-годдзем з дня ўтварэння Віцебскай вобласці. Самы паўночны рэгіён Беларусі заўсёды славіўся прыгажосцю прыроды, унікальнымі помнікамі, рамёствамі і майстрамі, а яшчэ доблесцю і стойкасцю жыхароў у гады ліхалецця, як гэта было ў час Вялікай Айчыннай вайны. На Віцебшчыне добра ведаюць цану Перамогі, умеюць захоўваць народную памяць, традыцыі і вернасць роднай зямлі. Дзякуючы нястомнай працы многіх пакаленняў, развіваецца сельская гаспадарка, асвойваюцца перадавыя тэхналогіі, будуюцца найноўшыя прадпрыемствы, мадэрнізуюцца вытворчасці, стваpаецца сучасная сацыяльная інфраструктура. Далёка за межамі Беларусі вядомае грандыёзнае свята мастацтва «Славянскі базар у Віцебску», якое, умацоўваючы сяброўства паміж народамі, кожны год збірае тысячы яркіх талентаў з усіх куткоў нашай планеты. Няхай добрая слава і традыцыі Віцебшчыны прымнажаюцца новымі справамі і здзяйсненнямі, а ў кожным доме пануюць шчасце, цяпло і ўтульнасць. Жадаем жыхарам вобласці здароўя, міру, дабрабыту і росквіту».

Сярод 50 лаўрэатаў звання «Чалавек года Віцебшчыны — 2022» — швачкі, аператары жывёлагадоўчых комплексаў, трактарысты, электрагазазваршчыкі, сацыяльныя работнікі, экскурсаводы, кіраўнікі вядучых прадпрыемстваў і арганізацый з усіх раёнаў вобласці. Аператар машыннага даення ААТ «Новыя Гараны» Полацкага раёна Эдмунд Паўліня паказаў самы высокі ў гаспадарцы сярэднегадавы надой з каровы, які склаў звыш 7,9 тысячы кілаграм. Аператар свінагадоўчага комплексу «Шайцерава» Верхнядзвінскага раёна Рыма Лапкоўская дасягнула паказчыка сутачнага прывесу маладняка ва ўзросце ад 0 да 2 месяцаў у памеры 240 грамаў, забяспечыўшы захаванасць пагалоўя на 95 працэнтаў. Аляксандр Зябко — трактарыст-машыніст «Баброва-Агра» Лепельскага раёна — у мінулы сезон намалаціў звыш сямі тысяч тон збожжавых і крыжакветных культур.

Аб дасягненнях паўночнага рэгіёна, перспектывах і ўпэўненым поглядзе ў будучыню распавёў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**: «Па выніках мінулага года Віцебшчына заняла першае месца ў краіне па экспарце тавараў, рознічным і аптовым тавараабароце, другое — па валавым рэгіянальным прадукце і экспарце паслуг. Сёння мы падтрымліваем знешнегандлёвыя зносіны са 107 дзяржавамі свету, у краіны «далёкай дугі» экспарт павялічыўся ў 12 разоў».

Якасць жыцця людзей у многім залежыць ад узроўню адукацыі і аховы здароўя. Аб высокай якасці адукацыі і прафесійным майстэрстве віцебскіх педагогаў сведчыць той факт, што Віцебшчына ўпершыню заняла першае месца па колькасці дыпломаў на рэспубліканскай алімпіядзе. Адной са знакавых падзей, якую плануецца здзейсніць у гэтым годзе, — здаць у эксплуатацыю мадэрнізаваны будынак Полацкага кадэцкага вучылішча.

«Дарагія землякі, мы аддаём даніну павагі прадстаўнікам розных прафесій, усіх сфер народнай гаспадаркі і галін. Сярод лаўрэатаў — рабочыя, жывёлаводы, трактарысты, настаўнікі — адным словам, прадстаўлены ўвесь спектр кадравага патэнцыялу рэгіёна. Вас, найлепшых, адрозніваe ўменне працаваць на вынік, патрыятызм і мэтанакіраванасць. Прафесіяналы сваёй справы — залаты фонд краю. Наша агульная мэта — замацаваць станоўчыя тэндэнцыі развіцця вобласці, зрабіць яе паспяховай і самадастатковай. Няхай адданасць справе і ваша праца стануць залогам мірнага заўтра», — падкрэсліў Аляксандр Міхайлавіч, уручаючы заслужаныя ўзнагароды найлепшым работнікам Прыдзвіння.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Камунальныя стасункі

# Рамонт дахаў, служба 115, прыстойны заробак

## Міністр ЖКГ агучыў асноўныя напрамкі сёлетняй работы галіны



**Гістарычна высокія паказчыкі па капітальным рамонце жылля — каля 3,5 млн м² адрамантавана за мінулы год. Амаль 6 млн м² замененага пакрыцця вуліц населеных пунктаў (на 50 % больш, чым у 2021-м). 97 % беларусаў забяспечаны якаснай пітной вадой у межах праграмы «Чыстая вада». Такія вынікі агучыў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ на выніковай калегіі ведамства, падчас якой былі падведзены вынікі мінулага года і акрэслены задачы на сёлета.**

Камунальнікі ацэньваюць вынікі сваёй леташняй работы як задавальняльныя і адзначаюць, што асноўныя задачы, запланаваныя на 2022-і, былі па большасці выкананы. Добрая дынаміка назіраецца ў рамонце вулічна-дарожнай сеткі — летась на яе рамонт было накіравана на 50 % больш сродкаў, чым папярэдне. Шмат пазітыўных зрухаў па забеспячэнні грамадзян вадой. Разам з тым існуе шэраг пытанняў, над якімі трэба сур'ёзна папрацаваць, расказаў міністр:

— Важны кірунак работы — утрыманне прыдамавых тэрыторый. Летась і сёлета ў зімовы перыяд былі прабуксоўкі па гэтым пытанні, таму яму ўдзелена асаблівая ўвага. На вырашэнне задачы, пастаўленай кіраўніком дзяржавы адносна рамонту дахаў шматкватэрных дамоў, сёлета дадаткова будзе выдзелена 50 млн рублёў. Пералік дамоў для рамонту ўжо складзены. Працягнецца таксама рэалізацыя задач праграмы «Камфортнае жыллё».

Яшчэ адзін напрамак дзейнасці міністэрства — пошук прыстойных кадраў для галіны і, адпаведна, прыстойнай аплаты іх работы. У найбліжэйшыя гады для захавання кадравага патэнцыялу ў ЖКГ мяркуюць выйсці на ўзровень сярэдняга заробку па краіне — пакуль ён у камунальнікаў 70 %.

Шмат нараканняў у людзей на работу адзінай дыспетчарскай службы 115, паведаміць у якую пра надзвычайную ці проста праблемную камунальную сітуацыю складана. Скардзяцца беларусы таксама і на тэрміны выканання работ, у тым ліку на прыёмах грамадзян у чыноўнікаў.

— Падчас аварыйных сітуацый дазваніцца ў службу сапраўды няпроста. Аднак трэба разумець, што пасля званка ўжо першага чалавека, хто дазваніўся і паведаміў пра аварыю, пытанне пачынае вырашацца, адпаведныя службы пачынаюць працаваць. Так што званкі астатніх людзей з аналагічнымі паведамленнямі ўжо не такія важныя. Я штодня зранку, у абед і вечарам набіраю 115 і дазвоньваюся. Максімальна мне прыходзілася быць у чарзе шостым з чаканнем дзве хвіліны, — пракаментаваў гэта міністр. — Магчыма зніveліраваць сітуацыю так, каб нават падчас аварый мець магчымасць прымаць усе званкі, аднак эканамічна гэта немэтазгодна, бо спатрэбіцца штат у 200 чалавек.

Сітуацыі вырашаюцца максімальна хутка. Усё залежыць ад таго, наколькі тэхнічна складанае здарэнне адбылося, запэўніў Андрэй Хмель:

— Мы заўжды праводзім вучэнні, і нашы службы заўжды ў стане гатоўнасці. Вельмі цяжка абысціся зусім без аварый, як бы ні хацелася, і гэта аб'ектыўна, што нешта здараецца. На нядаўні буйной аварыі ў Пружанах мы спрацавалі хутка, якасна і кругласутачна там былі людзі, у тым ліку кіраўніцтва вобласці. Мы гатовыя да любых сітуацый, аднак галоўнае — не дапускаць іх. А для гэтага кожны павінен дакладна выконваць свае абавязкі на рабочым месцы. Аварыйная заяўка выконваецца за гадзіны. Праблемы, якія не датычацца аварыйных работ, — устараняюцца цягам сутак. Гэта прадугледжана рэгламентам службы 115, і людзі маюць права на гэта разлічваць.

Міністр заўважыў, што 130 тысяч чалавек, якія працуюць у галіне ЖКГ, з пазітывам глядзяць у будучыню. Ён выказаў спадзяванне, што прыманыя вялікай камандай камунальнікаў меры створаць умовы для падтрымання камфортнага пражывання беларусаў, каб людзі былі задаволеныя.

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## На аднаўленне дамоў пасля землетрасення ў Турцыі можа спатрэбіцца $100 млрд



У Турцыі на аднаўленне пашкоджаных дамоў, а таксама на стварэнне неабходнай інфраструктуры можа спатрэбіцца 100 мільярдаў долараў. Аб гэтым заявіў кіраўнік Палаты архітэктараў у Саюзе палат турэцкіх інжынераў і архітэктараў Эйуп Мухчу, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, у выніку стыхійнага бедства пашкоджана каля 3,4 мільёна будынкаў, палову з іх давядзецца знесці. «Каб аднавіць гэтыя дамы, трэба таксама пабудаваць інфраструктуру і грамадскія аб'екты», — заявіў Мухчу. Пры гэтым адзначаецца, што ў экспертаў на сёння няма поўнай інфармацыі аб маштабах разбурэнняў, таму адзнакі кошту аднаўлення значна адрозніваюцца.

## КНДР папярэдзіла аб беспрэцэдэнтным адказе на вучэнні Паўднёвай Карэі і ЗША

КНДР беспрэцэдэнтна адкажа на ваенныя вучэнні ЗША і Паўднёвай Карэі, папярэдзіў прадстаўнік МЗС Паўночнай Карэі, артыкул якога апублікаваў ЦТАК. «Калі ЗША і Паўднёвая Карэя па сваёй заяве ажыццявяць іх праект ваенных вучэнняў, якія мы са справядлівымі апасеннямі і абгрунтаванасцю лічым падрыхтоўкай да агрэсіўнай вайны, то яны сутыкнуцца з небывалым працяглым беспрэцэдэнтным рашучым адказам», — адзначаецца ў артыкуле. «Рэальнасць дакладна сведчыць аб тым, што менавіта ЗША і Паўднёвая Карэя з'яўляюцца завадатарамі, якія наўмысна парушаюць мір і стабільнасць на Карэйскім паўвостраве і ў рэгіёне», — заяўляе аўтар артыкула. Нягледзячы на такія факты, дадае дыпламат, СБ ААН «не стрымлівае ЗША, якія спрабуюць ператварыць Карэйскі паўвостраў у поле ваенных вучэнняў і ваенную базу». Як вядома, Сеул і Вашынгтон плануюць правесці сумесныя вясновыя вучэнні Freedom Shield, якія павінны адбыцца ў наступным месяцы.



## Брытанскі вытворца прэпарату ад пякоткі звыш 40 гадоў хаваў, што ён правакуе рак

Брытанская фармацэўтычная кампанія Glaxo University каля 45 гадоў хавала інфармацыю аб тым, што іх прэпарат ад пякоткі і язвы страўніка Zantac правакуе рак. Аб гэтым паведаміла агенцтва Bloomberg. Паводле яго даных, кампанія з 1978 года была папярэджана ўласнымі вучонымі і незалежнымі даследчыкамі аб патэнцыяльнай небяспецы прэпарату. Кіраўніцтва хавала інфармацыю аб гэтым ад пакупнікоў і працягвала яго прадаваць па свеце. На думку экспертаў, прэпарат Zantac змяшчае дзеючае рэчыва ранітыдын, які выдзяляе моцны канцэраген НДМА. Канцэраген пад назвай НДМА калісці дадавалі ў ракетнае паліва, а цяпер навукоўцы яго выкарыстоўваюць толькі для таго, каб выклікаць штучна рак у лабараторных пацукоў. Аб небяспецы лекаў стала вядома толькі ў 2019 годзе, і толькі тады вытворца Zantac і рэгулятары аховы здароўя па ўсім свеце адклікалі прэпарат, а вясной 2020-га Упраўленне па санітарным наглядзе за якасцю харчовых прадуктаў і медыкаментаў ЗША наогул забараніла яго продаж. Больш чым 70 тысяч чалавек, якія прымалі Zantac, падалі на кампанію ў суд. Першая судовая справа пачнецца напрыканцы лютага ў Вярхоўным судзе ў амерыканскім штаце Каліфорнія. Як адзначае агенцтва, Zantac быў самым прадаваным прэпаратам у свеце. Кампанія атрымала за яго ўзнагароду ад каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II, а выканаўчага дырэктара Эндру Уіці пасвяцілі ў рыцары.



## Васіль ГАЎРУКОВІЧ: «МЫ САМІ МЯНЯЕМ СТАЎЛЕННЕ ГРАМАДСТВА ДА ІНВАСПОРТУ»



**У Магілёве сёлета снежна. Снег шчодра накрыў горад, а спецыялісты з дапамогай адмысловай тэхнікі ўкаталі яго ў лыжню. Цяпер у Пячорскім лесапарку не змаўкаюць дзіцячыя галасы. Тут займаюцца навучэнцы абласной спартыўнай дзіцяча-юнацкай школы прафсаюзаў «Спартак», адной са шматлікіх спартыўных школ краіны. Але «Спартак» — школа ўнікальная: толькі тут лыжным майстэрствам авалодваюць падлеткі з парушэннямі зроку і апорна-рухальнага апарату, будучыня паралімпійскага спорту. З 242 навучэнцаў школы 20 маюць асаблівасці ў стане здароўя. Адзінае ў краіне лыжнае аддзяленне для дзяцей з інваліднасцю адкрылася ў школе ў 2018 годзе. Адкрыццё новых аддзяленняў у спартыўных школах — падзея звычайная, але далёка не кожная школа можа прыняць дзяцей, якія маюць праблемы са здароўем. Магілёўскі «Спартак» змог дзякуючы намаганням і актыўнасці аднаго чалавека — Васіля Гаўруковіча, чые энтузіязм і ідэі дапамагаюць развівацца айчыннаму паралімпійскаму спорту. Цяпер ён узначальвае ўнікальную школу.**



Сваю гісторыю любові са спортам Васіль Юр'евіч называе банальнай: за савецкім часам у дзяцей з Магілёва было не так шмат забавак, каб грэбаваць заняткамі спортам. Ды і ў Магілёве лыжныя традыцыі маюць добрыя карані. Цікавы факт: першая беларуская прызёрка зімовых Алімпійскіх гульняў Рыта Ачкіна нарадзілася менавіта ў Магілёве. На Алімпіядзе 1968 года яна заваявала «бронзу» ў лыжных гонках.

«Я займаўся любімай справай, атрымліваў задавальненне, увайшоў у зборную каманду Рэспублікі Беларусь. Але ў кожнага свая мяжа здольнасцяў. Праз час аналізуючы сябе як спартсмена, як трэнер я разумею, што ў мяне не было такіх здольнасцяў, як у нашых лідараў. Мой найлепшы вынік — 11-е месца на першынстве свету, неаднаразова перамагаў на рэспубліканскіх спаборніцтвах. Але гэта не тыя вынікі, якія б мне хацелася, якімі можна было б ганарыцца», — дзеліцца Васіль Юр'евіч. Затое можна ганарыцца вынікамі спартсменаў, з якімі ён працаваў ужо як трэнер. Самая знакамітая з іх — Ядвіга Скорабагатая, паралімпійская чэмпіёнка 2002 года, уладальніца васьмі паралімпійскіх медалёў у лыжных гонках.

«У 1998 годзе я не трапіў на Алімпійскія гульні ў Нагана. І ў якасці заахвочвання мне прапанавалі паехаць на Паралімпійскія гульні, дапамагчы камандзе. Вельмі хацелася пабываць у Японіі, было цікава паглядзець на такія маштабныя спаборніцтвы, я пагадзіўся. Дапамагаў камандзе з аправцоўкай лыж, рознымі тэхнічнымі момантамі, там жа адбыўся мой першы вопыт у якасці лідара», — успамінае Васіль Гаўруковіч. Варта патлумачыць: у паралімпійскім лыжным спорце і біятлоне лідар — гэта чалавек, які «вядзе» спартсмена з парушэннямі зроку на дыстанцыі, ён бяжыць наперадзе, а спартсмен, арыентуючыся на голас, бяжыць за ім. Зразумела, што на лідары ляжыць вялікая адказнасць за вынік. «Без лідара развіццё спартсмена спыняецца. І часта лідар дае больш, чым трэнер. Ён бяжыць са спартсменам на дыстанцыі, ён яго адчувае. Татальна сляпыя бягуць на голас. Бег без лідара і бег з лідарам даюць розныя вынікі, з лідарам, натуральна, вынік вышэйшы. Самае галоўнае — гэта давер. Скорабагатая ехала за мной, нават калі б спераду была прорва. Трэба дабіцца таго, каб спартсмен давяраў лідару больш, чым сабе. Без лідара немагчыма паказаць высокі вынік і немагчыма зрабіць эфектыўную тэхнічную трэніроўку. Для поспеху павінна быць трыа — лідар, трэнер і спартсмен», — тлумачыць Васіль Гаўруковіч. З Ядвігай Скорабагатай ён супрацоўнічаў і як лідар, і як трэнер. Медалі з Паралімпійскіх гульняў 2002, 2006 і 2010 — найлепшы паказчык іх працы.

«У Нагана я ўбачыў выступленні Ядвігі, ацаніў яе ўзровень і зразумеў, што яна можа прэтэндаваць на прызавое месца. У 1998 годзе ў паралімпійцаў яшчэ не было адзінай нацыянальнай каманды, але, зразумела, паміж сабой усе мелі зносіны. Я разумеў, што магу дапамагчы Ядвізе, яна гэта разумела. І за паўтара года да Гульняў у Солт-Лейк-Сіці мы сталі працаваць, нам далі стыпендыю, каб былі магчымасці для падрыхтоўкі. Усё было нармальна, калі не ўлічваць, што я жыў у Магілёве, а Ядвіга — у Гродне. Але справа толькі ў мэце і ідэі — астатняе ўсё можна вырашыць. У Ядвігі было вялізнае жаданне працаваць і перамагаць, яна прысвячала трэніроўкам увесь свой час. Я ездзіў да яе ў Гродна, яна — да мяне ў Магілёў. Так і працавалі. На руку і тое, што Ядвіга была ўжо падрыхтаванай спартсменкай. На Паралімпійскіх гульнях 1996 года яна стала бронзавым прызёрам па лёгкай атлетыцы. Яна разумела, як павінен трэніравацца прафесійны спартсмен. Гэта чалавек, які ніколі не сядзіць на месцы. Яе спартыўныя здольнасці разам з тымі ведамі і вопытам, што я ёй даў, дазволілі паказаць самы высокі вынік», — расказвае Васіль Гаўруковіч.

Дзякуючы прыкладу Ядвігі Скорабагатай, як і многіх іншых спартсменаў, паралімпійскі спорт стаў паўнавартаснай часткай спартыўнага жыцця краіны. «Усё пачыналася як сацыяльная адаптацыя, рэабілітацыя людзей з інваліднасцю. Цяпер паралімпійскі рух носіць сапраўдны спартыўны характар. Усе разумеюць, што медаль трэба зарабіць потам і крывёю. У 2017 годзе адкрыўся Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскіх і дэфалімпійскіх відах спорту — паралімпійскі спорт выйшаў на новы прафесійны ўзровень. Самае галоўнае, што з'явілася магчымасць зрабіць інваспорт прафесійнай дзейнасцю, раней усё трымалася на энтузіязме. Мы самі мяняем стаўленне грамадства да інваспорту», — упэўнены Васіль Гаўруковіч.

### «У нас ёсць адзінае патрабаванне — спорт»

У сувязі з гэтым адкрыццё аддзяленняў для дзяцей з інваліднасцю ў спартыўных школах падаецца абсалютна лагічным і правільным крокам. Аб якім прафесійным спорце можа ісці гаворка без рэзерву? Але і тут на першым месцы пакуль стаіць энтузіязм.

«Працу з Ядвігай Скорабагатай я скончыў у 2011 годзе, стаў працаваць у спартыўнай школе. Думкі аб аддзяленні для дзяцей з інваліднасцю меліся, але было страшна, ці набяром дзяцей, ці прыйдуць яны, як да гэтага паставяцца бацькі. Ды і вопыту было малавата. Я паступова вучыўся працаваць з дзецьмі, заняў пасаду намесніка дырэктара ў школе. У 2018 годзе з'ездзіў на Паралімпійскія гульні, вельмі натхніўся і зразумеў: трэба адкрываць аддзяленне. Дырэктар школы падтрымала», — расказвае Васіль Юр'евіч. А пазней дырэктарам школы стаў і ён сам.

«Самае галоўнае — нашы спартсмены. Магчымасці абласной школы дазваляюць набіраць дзяцей з усёй Магілёўскай вобласці. Наша асноўная апора — Шклоўская спецшкола-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку. Дзеці там знаходзяцца пастаянна, яны занятыя, і спорт стаў добрай часткай іх распарадку. У выйгрышы застаюцца ўсе: дзеці займаюцца спортам, і наша аддзяленне можа плённа працаваць», — адзначае Васіль Гаўруковіч. Аднак рэсурсаў адной толькі школы-інтэрната недастаткова. Таму «Спартак» пастаянна шукае патэнцыяльных выхаванцаў. «Складана знайсці дзіця, якое мае праблемы са здароўем і хацела б займацца спортам. Але яшчэ складаней растлумачыць яго бацькам, чым спорт можа быць карысны. У нас ёсць база даных, якую напрацоўваем шляхам зносін, сустрэч, наведванняў школ. Я тэлефаную, угаворваю, многія, здаецца, і цікавяцца, але да нашай школы не даходзяць. Набор вучняў — вельмі руплівая праца. Бывалі прыклады, калі бацькі самі прасілі ўзяць іх дзіця, але дактары не давалі дазволу. Мы тлумачылі, што ў нас асаблівая методыка, што здароўю нічога не пагражае. Быў выпадак, калі хлопцу даведку для заняткаў паралімпійскімі лыжнымі гонкамі далі, а ўнізе заключэнне — не прыдатны. Перамовы з медыкамі вяліся амаль два гады. Паколькі ў кожнага нашага спартсмена — розныя дыягназы, могуць быць розныя наступствы заняткаў спортам — да кожнага вучня ў нас індывідуальны падыход», — расказвае Васіль Юр'евіч.

Многія спецыялісты ў паралімпійскім спорце ўпэўнены, што спартсменам з інваліднасцю, калі тым дазваляе стан здароўя, варта трэніравацца ў адных групах са здаровымі спартсменамі. Па-першае, так вырашаецца пытанне сацыяльнай адаптацыі інвалідаў, па-другое, павышаецца іх спартыўны ўзровень. У Магілёўскай СДЮШАР прафсаюзаў «Спартак» гэта пацвярджаюць летнія спартыўныя лагеры для выхаванцаў школы. Спартсмены разам трэніруюцца, жывуць, ладзяць конкурсы і творчыя вечары. «Яны там не толькі адпачываюць. Мы ў лагеры робім такую спартыўную працу, якую на працягу сезона не заўсёды выконваем. Не заўсёды нарматыўна-прававая база і тэхніка бяспекі даюць магчымасць праводзіць сумесныя трэніроўкі інвалідаў і здаровых спартсменаў. Але калі спартсмен ужо высокага ўзроўню і мы бачым, што ён не згубіцца сярод здаровых, то, вядома, яны трэніруюцца разам, разам ездзяць на зборы. Нашым спартсменам не хапае канкурэнцыі, не хапае спарынг-партнёраў. Таму праводзім хуткасныя трэніроўкі са здаровымі спартсменамі, даводзіцца гэта рабіць. Часта нашы здаровыя спартсмены становяцца лідарамі для сваіх таварышаў», — заўважае Васіль Гаўруковіч.

Вялікая праблема не толькі Магілёўскай спартыўнай школы, але і ўсёй галіны — трэнерскія кадры, іх катастрафічна не хапае. Васіль Юр'евіч адзначае, што ў школе былі б рады спецыялісту, але не кожны трэнер зможа працаваць са спартсменамі з інваліднасцю. Адным не хапае ўпэўненасці, другім — ведаў. Адукацыя трэнераў для паралімпійцаў — яшчэ адна глабальная праблема. Няма дакладнай сістэмы навучання такіх спецыялістаў. Хто хоча вучыцца сам, але такіх фанатаў, зразумела, адзінкі. Вось і ў Магілёўскай СДЮШАР прафсаюзаў «Спартак», акрамя Васіля Гаўруковіча, які больш заняты на пасадзе дырэктара, з вучнямі-паралімпійцамі працуе толькі адзін трэнер — Анастасія Каралькова. У дапамогу — мудрае планаванне часу і, у прыватнасці, тое, што ў юных паралімпійцаў толькі адна трэніроўка ў дзень. Дзве трэніроўкі могуць нашкодзіць іх здароўю і дадаць лагістычных праблем: на інвалідным калясцы вельмі нязручна два разы на дзень ездзіць на трэніроўку.

«У нас ёсць трэнеры ў Бялыніцкім, Круглянскім раёнах, у Асіповічах і ў Магілёўскім раёне. Імкнёмся развіваць паралімпійскі спорт па ўсёй вобласці. Але трэнер не заўсёды гатовы ўзяць такое дзіця, ён баіцца, не ведае, як да яго паставіцца, як з ім





працаваць. Наш трэнер Анастасія Андрэеўна Каралькова ўжо ўсё ведае, бачыць і разумее, нічога не баіцца. Яна ўжо атрымлівае асалоду ад працы. Анастасія Андрэеўна ведае, што можа з дзецьмі зрабіць, у яе ёсць лыжаролерная траса, зала, інвентар, магчымасць выехаць на спаборніцтвы, арганізаваць зборы», — расказвае Васіль Юр'евіч.

Па яго словах, у рабоце з асаблівымі спартсменамі трэнеры пабажлівасці нікому не аказваюць: «Сваім беражлівым стаўленнем мы можам нашкодзіць. У нас ёсць патрабаванне — гэта спорт. Калі не будзем патрабаваць дысцыпліны і выканання нашага аб'ёму і ўвесь час будзем гладзіць па галаве, нашкодзім. Таму, нягледзячы на нашыя блізкія адносіны са спартсменамі, імкнёмся вытрымліваць дыстанцыю, праводзіць бухаваўчую працу. Разумеем, што ў нас няма рэзэрву. І тое ж самае адчувае нацыянальная каманда. Не так шмат спартсменаў у нашай краіне ў будучыні могуць стаць лідарамі сусветнага спорту. Улічваючы гэта, імкнёмся працаваць з імі такім чынам, каб яны правялі ў спорце шмат гадоў. Гэта значыць не фарсіруем падрыхтоўку ў маладым узросце. Калі моцна нагружаць 17-гадовага спартсмена, да 25 гадоў ад яго нічога не застанецца. Гэта вельмі тонкая грань. Трэба адчуваць свайго падапечнага — у гэтым і ёсць мастацтва трэнера і мастацтва падрыхтоўкі спартсменаў».

### «Яны ўспрынялі гэта як шанц на новае нармальнае жыццё»

Сумесныя намаганні трэнераў прывялі іх падапечных да нацыянальнай каманды. Уладзіслаў Кандратаў мог бы выступіць на Паралімпійскіх гульнях у Пекіне, калі б не тое несправядлівае адхіленне. Уладзіслаў родам са Шклова, у дзяцінстве, як многія хлопчыкі, любіў спорт, перавагу аддаваў хакею. Але ў 15 гадоў жыццё Уладзіслава кардынальна змянілася. Напярэдадні свайго дня нараджэння ён вырашыў пакатацца на старым скутары, які сам рамантаваў. Паехаў, але перад цягніком спыніцца не змог, падвялі тармазы... Бальніца, аднаўленне, рэабілітацыя... Новае жыццё, ужо без ног. І новы від спорту — лыжныя гонкі. Спецыяльны інвентар для хлопца знайшоў Васіль Гаўруковіч, ён жа запэўніў Улада і яго бацькоў, што варта паспрабаваць. Снегу тады не было, таму першае знаёмства з новым заняткам — на ролерах. «Зразумела, што траўма была і ў самога Улада, і ў бацькоў. І тут ім кажуць пра нейкія магчымасці, расказваюць пра тое, што ніколі не бачылі і не чулі. Яны гэта ўспрынялі як шанц на новае нармальнае жыццё. Я шмат расказваў Уладу пра паралімпійскі спорт, скідваў відэа, матэрыялы. Затым прыцягнулі яго на зборы. Першы раз падаў, баяўся, але з часам уцягнуўся. Пачаў адэкватна рэагаваць на нашу нагрузку. Стаў выконваць нашы патрабаванні, што вельмі важна, таму што не ўсе на гэта гатовыя. І паступова Улад «уліўся», гэта стала яго ладам жыцця. Калі мы размаўляем з бацькамі — кажам, што ў іх дзіцяці ёсць шанц на самарэалізацыю. Можа не атрымацца, усе хочуць быць чэмпіёнамі, але не ў кожнага атрымліваецца. Але ж паспрабаваць можна. Дзіця, якое да нас прыходзіць, нічога не губляе», — адзначае Васіль Юр'евіч. Нядаўна Уладзіслаў Кандратаў выступаў на Кубку Расіі сярод спартсменаў з парушэннем апорна-рухальнага апарату. Заняў чацвёртае месца, здаецца, медаля няма, але вынік нядрэнны — асабліва калі ўлічваць, што сярод юніёраў ён быў найлепшы. Спартсмен таксама стаў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Па словах Васіля Гаўруковіча, Улад атрымлівае асалоду ад спорту, таму задача трэнераў — рыхтаваць яго да наступных стартаў і падтрымліваць матывацыю.

Зусім блізка да галоўнай каманды краіны падышла Аляксандра Гуркіна, вучаніца Шклоўскай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Дзяўчынка амаль нічога не бачыць, але змагла выканаць нарматыў кандыдата ў майстры спорту, выканаць усе разрадныя нормы для адбору ў зборную каманду. «Перспектыва ёсць, але трэба працаваць. З Сашай працаваць складана, таму што яна практычна нічога не бачыць і з ёй увесь час павінен хтосьці быць. Пастаяннага лідара няма. Саша яшчэ школьніца, і, калі пасля Шклова яна пяройдзе ў Магілёў, мы гэту працу сістэматызуем. Пакуль жа спрабуем яе развіваць. Саша прагрэсіруе з году ў год, але гэта вельмі карпатлівая праца. Калі Улад Кандратаў займаўся хакеем, то Саша ніколі спортам не займалася, і яе сардэчна-сасудзістая сістэма не развіта належным чынам. Гэты недахоп трэба кампенсаваць, а гэта не год і не два. Ці зможам мы, ці зможа яна, ці зможам знайсці лідара, развіць гэтую перспектыву — пакуль пад пытаннем», — адзначае Васіль Юр'евіч.

Зразумела, што лепей за ўсё спартыўныя навыкі развіваюцца ў спаборніцтвах. На жаль, пакуль спартсмены пазбаўлены міжнароднай спаборніцкай практыкі. Але, па словах Васіля Гаўруковіча, яго вучням яе хапае і ўнутры краіны, дапамагаюць сумесныя спаборніцтвы з расійскімі паралімпійцамі.

Пакуль у Магілёўскай СДЮШАР прафсаюзаў трэніруюцца толькі лыжнікі: здаровыя і тыя, хто мае асаблівасці здароўя. Але, па словах Васіля Гаўруковіча, ёсць планы адкрыць аддзяленне па стральбе з лука для паралімпійцаў. Ужо знайшлі інвентар, ахвотных. Але самая вялікая праблема — няма трэнера. Магчыма, гэта таксама шанц для спецыяліста, які шукае сябе...

**Фота Лізаветы ГОЛАД,**
*г. Магілёў.*

Сяргей КАВАЛЬЧУК:

# «МЫ СПРАВІЛІСЯ З УСІМІ ВЫКЛІКАМІ»

**У Міністэрстве спорту і турызму Рэспублікі Беларусь падвялі вынікі 2022 года і акрэслілі планы і задачы на 2023-і.**

Мінулы год для спартыўнай галіны нашай краіны нельга назваць удалым і паспяховым. Але, нягледзячы на ўсе выклікі, у мінулым годзе айчынная спартыўная галіна спрацавала стабільна. Пра гэта заявіў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** «У 2022 годзе з боку Захаду па надуманых падставах былі ажыццёўлены беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск на нашу спартыўную галіну і Беларусь у цэлым. Гэтыя рашэнні не адпавядалі ніякім міжнародным прававым нормам, таму мы накіравалі неабходныя заявы ў адпаведныя апеляцыйныя інстанцыі. Цяпер Міжнародны алімпійскі камітэт выдае нясмелыя заявы па магчымым вяртанні беларускіх атлетаў, мы назіраем за сітуацыяй, аналізуем яе і выпрацоўваем рашэнні, якія абароняць нашых спартсменаў», — адзначыў ён. Віцэ-прэм'ер заўважыў, што з сакавіка мінулага года Беларусь узмацніла спартыўнае супрацоўніцтва з партнёрамі з Расіі. Гэта дазволіла спартсменам мець неабходную спаборніцкую практыку. «Незалежна ад удзелу заходніх краін у нашых турнірах мы ўсё роўна будзем мець спаборніцкую практыку», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Такога ж пункту погляду прытрымліваецца і **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.** «Мы справіліся з усімі выклікамі. І скончылі 2022 год з нядрэннымі вынікамі, нягледзячы на тое, што наша краіна была падвергнута санкцыям у дачыненні да спорту. Але колькасць спаборніцтваў у Беларусі не зменшылася, а ў многіх відах спорту іх нават стала больш. Выступленні нашых спартсменаў абнадзейваюць. Пачатак года выдаўся добрым для Беларусі дзякуючы трыумфу Арыны Сабаленкі на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі па тэнісе. Перамогаў на турнірах Вялікага шлема ў нас не было ўжо 10 год. Для нашай краіны гэта несумненны поспех. Нашы спартсмены дамінуюць і ў іншых відах спорту, асабліва хочацца адзначыць поспехі ў адзінаборствах і кулявой стральбе. Заслугоўваюць пахвалы таксама скачкі на батуце, біятлон, фрыстайл, веславанне і мастацкая гімнастыка. Пачынае выходзіць з ценю і фехтаванне», — адзначыў міністр. У прыклад ён прывёў лічбы: у мінулым годзе на замежных спаборніцтвах беларускімі спартсменамі было заваявана 213 медалёў. Прадэманстраваць сваё майстэрства беларускія спартсмены змогуць і ў жніўні гэтага года на II Гульнях краін СНД, якія прыме Беларусь. Спаборніцтвы больш чым па 20 відах спорту прымуць 11 беларускіх гарадоў.

Сяргей Кавальчук падкрэсліў, што мінспорту робіць акцэнт на развіцці дзіцяча-юнацкага і масавага спорту. «Мы бачым, што падрастае дастойнае новае пакаленне, у многіх відах добры рэзерв. Акрамя дзіцячага спорту, асновай нашай сферы з'яўляецца масавы спорт. Чым больш людзей будзе займацца спортам, тым лепш для краіны, таму стаіць задача на ўсіх узроўнях уцягваць у гэту справу калектывы арганізацый. У краіне выдатныя ўмовы, аб'екты ёсць у любым раённым і абласным цэнтры. Дзяржава робіць вельмі многае для развіцця фізічнай культуры і спорту, такому падыходу можа пазайздросціць любая краіна свету», — упэўнены ён.

# ТОЛЬКІ Ў ДЫЯЛОГУ НАРАДЖАЕЦЦА ІСЦІНА

## Чым карысны Нацыянальны форум трэнераў па тэнісе?

**Перамога Арыны Сабаленкі на Australian Open, высокія пазіцыі беларускіх тэнісістаў у сусветных рэйтынгах — толькі вяршыня айсберга. Каб яе дасягнуць, мноства людзей кожны дзень праводзяць руплівую працу, якая, магчыма, нябачная, але неабходная. Зразумела, што не абыходзіцца без складанасцяў і праблем. Каб іх вызначыць і знайсці рашэнне, больш за 80 спецыялістаў з усёй краіны — трэнеры, кіраўнікі, урачы — сабраліся на Нацыянальным форуме трэнераў па тэнісе. Мерапрыемства ўжо другі раз прайшло ў штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта.**

«Форум — унікальная пляцоўка для ўзаемадзеяння трэнераў з усёй краіны і Беларускай тэніснай федэрацыі, паміж рознымі спецыялістамі з розных рэгіёнаў. Ён дае магчымасць абмеркаваць актуальныя пытанні бягучай работы, намеціць планы на будучыню. Другі год федэрацыя праводзіць гэта мерапрыемства, і другі год мы бачым па колькасці трэнераў, якія заявіліся, што дадзенае мерапрыемства з'яўляецца актуальным і дапамагае вырашаць стратэгічныя пытанні. Былі ўзняты пытанні, звязаныя са змяненнем заканадаўства ў спартыўнай сферы, а таксама расстаўлены акцэнты па ўзаемадзеянні з нацыянальнай камандай, з трэнерамі ў рэгіёнах. Зроблены акцэнт на ўзмацненне ініцыятывы з боку трэнераў, асабліва ў рэгіёнах, бо гэта важна і для федэрацыі ў тым ліку», — адзначыла **Кацярына ЛІСІЦА, генеральны сакратар Беларускай тэніснай федэрацыі.**

Як заўважыла **старэйшы трэнер нацыянальнай каманды па рэзерве Ірына ХРЫПАЧ,** тэнісныя трэнеры шмат часу праводзяць у раз'ездах, таму сабраць іх разам дарагога варта. «Самае галоўнае, што трэба разумець, што толькі ў дыялогу, у зносінах нараджаецца ісціна, вырашаюцца пытанні», — заўважыла яна. Вядучай тэмай для абмеркавання ўдзельнікамі Нацыянальнага форуму трэнераў стала развіццё тэніса ў рэгіёнах. У размове з журналістамі Ірына Хрыпач заўважыла, што ў рэгіёнах вострa стаіць кадравая праблема. Не ўсе рэгіянальныя школы, нягледзячы на свае добрыя ўмовы, могуць прыцягнуць маладога спецыяліста. У некаторых абласцях трэнеры працуюць, але не могуць набраць спартсменаў у групы. У сталіцы гэта прасцей вырашыць, трэнеры могуць абмяняцца гульцамі, правесці сумесныя трэніроўкі. У рэгіёнах вырашыць гэту праблему значна складаней. Таму, як правіла, альбо трэнер губляе свайго гульца — ён пераходзіць туды, дзе лепшыя ўмовы — альбо ў групе падае матывацыя. Для падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву ў рэгіёнах неабходна і якасная інфраструктура. Улічваючы кліматычныя асаблівасці, неабходна будаваць крытыя корты, што досыць затратна. Але абсалютна рэальна. Па прыклад варта ехаць у Салігорск. Пры падтрымцы ААТ «Беларуськалій» у 2021 годзе былі пабудаваны корты і створаны ўсе ўмовы для заняткаў тэнісам. У дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе працуе тры штатныя трэнеры па тэнісе, і з кожным годам колькасць ахвотных узяць у рукі ракетку толькі ўзрастае. У лютым тут упершыню прайшоў турнір па тэнісе ў рамках нацыянальнага календара Беларускай тэніснай федэрацыі — «Адкрытае першынство ўстановы ДЮСШ ППА ААТ «Беларуськалій» па тэнісе на прызы ААТ «Беларуськалій» (U8, U9).

«Выезды рэгіянальных трэнераў на міжнародныя спаборніцтвы — яшчэ адна задача для выканання, над якой мы актыўна працуем. Пытанні заўсёды былі, ёсць і будуць, але ў цэлым я рада, што ў нас шчыльнае ўзаемадзеянне з рэгіёнамі. Мы выязджаем туды рэгулярна з практычнымі семінарамі, запрашаем трэнераў і гракоў у Мінск. Гэты форум — працяг працы», — адзначыла Ірына Хрыпач. Развіццё не толькі тэнісу, але і любога іншага спорту ў рэгіёнах — праца, якая патрабуе шмат намаганняў і актыўнасці людзей, якія не баяцца прызнаваць свае праблемы і разам шукаць шлях іх вырашэння. І Нацыянальны форум трэнераў толькі ў дапамогу.

Шмат увагі ўдзельнікі форуму ўдзялілі абмеркаванню Закона «Аб ліцэнзаванні», надзвычай актуальнага сёння. «Нягледзячы на тое, што прадстаўнікі федэрацыі пастаянна імкнуцца наведваць усе куткі нашай краіны, гэты форум — яшчэ адна магчымасць сказаць аб наболелым і скарэкціраваць планы федэрацыі», — адзначыў **старшыня Беларускай тэніснай федэрацыі Сяргей РУТЭНКА.** Ён расказаў, што пасля мінулагодняга форуму некаторыя пытанні былі вырашаны літаральна за некалькі месяцаў. Напрыклад, на першым форуме актыўна абмяркоўваліся недахопы ў прафесійнай падрыхтоўцы трэнераў па тэнісе. Кіраўніцтва федэрацыі «пачула» і разам з кіраўніцтвам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры праблему вырашыла.

Нацыянальны форум трэнераў па тэнісе ўжо другі год запар паказвае, што для вырашэння праблем іх трэба не замоўчваць, а абмяркоўваць. Бо такая вялікая праца, як развіццё спорту, робіцца разам і ў дыялогу.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

# ВОГНЕННЫ ЦЯГНІК З АТРУТАЙ

## Чаму ў ЗША замоўчваюць найбуйнейшую экалагічную катастрофу?

**У раёне мястэчка Усходняя Палесціна, што ў амерыканскім штаце Агаё, праз два тыдні пасля крушэння цягніка з вінілхларыдам карціна насамрэч нагадвае наступствы апакаліпсіса. Асобныя амерыканскія медыярэсурсы, якія асвятляюць тэхнагенную катастрофу, параўноўваюць інцыдэнт з выбухам атамнай бомбы, называючы «амерыканскім Чарнобылем», а наступствы «лакальнай ядзернай зімой» для цэлага рэгіёна, адзначае topwar.ru. Пры гэтым улады ўсяляк імкнуліся да таго, каб трымаць інфармацыю «ў сакрэце» і нават жорстка перашкаджалі прафесійнай дзейнасці журналістаў. Чаму ў ЗША замоўчваюць найбуйнейшую экалагічную катастрофу?**



### «Мы знішчылі гэты горад»

Злавесным месцам невялічкае мястэчка з амаль што біблейскай назвай Усходняя Палесціна стала 3 лютага, калі паўсотні вагонаў грузавога цягніка з хімікатамі сышлі з рэек. Адбылася маштабная ўцечка вінілхларыду, які, акрамя праблем з агульным атручэннем і забруджваннем паветра, вады і глебы, здольны правакаваць развіццё анкалогіі. Тады ў амерыканскіх масмедыя гэтая інфармацыя прайшла мімаходзь.

Амерыканскі кангрэсмен Джамаан Боўман напісаў у «Твітэры», што ў вагонах знаходзілася 500 тон вінілхларыду. Ён назваў няшчасны выпадак адной з самых згубных для навакольнага асяроддзя катастроф за апошнія дзесяцігоддзі. Улады не прыдумалі нічога лепшага, чым утылізаваць хімію з дапамогай «кантраляванага падпалу», што толькі павялічыла плошчу заражэння. Гэта прывяло да яшчэ мацнейшага выбуху, які сваёй формай нагадаў відавочцам ядзерны. Над раёнам па-ранейшаму вісіць вельмі шчыльнае воблака небяспечных прадуктаў гарэння, бачнае нават з вышыні птушынага палёту. Вада ў рэках заражана ў радыусе не менш як 50 кіламетраў, у наваколлі ў фермераў пачалася масавая пагібель буйной рагатай жывёлы, гінуць птушкі і рыбы.

EPA класіфікуе вінілхларыд як канцэраген, уздзеянне якога на арганізм можа павялічыць рызыку пашкоджання печані або раку печані. Кароткачасовае ўздзеянне высокіх канцэнтрацый можа выклікаць дрымотнасць, страту каардынацыі, дэзарыентацыю, млоснасць, галаўны боль. Пасля згарання вінілхларыд распадаецца на хлорысты вадарод і фасген. Апошні выкарыстоўваўся ў якасці хімічнай зброі ў Першай сусветнай вайне, нагадвае topwar.ru. Працяглае ўздзеянне прадуктаў распаду вінілхларыду прыводзіць да страты прытомнасці і можа стаць фатальным для чалавека, паведамляюць спецыялісты. Пры няпоўным яго згаранні ў паветры застаюцца дысперсныя завісі дыяксінаў, устойлівыя да рассейвання.

«Мы знішчылі гэты горад хімікатамі», — заявіў у прамым эфіры вядучаму тэлеканала Fox News Такеру Карлсану былы начальнік пажарнай аховы Агаё. Вінілхларыд з'яўляецца канцэрагенам для людзей. «Не можа быць бяспечнага ўзроўню ўздзеяння, таму ўсе кантакты павінны быць зведзены да мінімальна магчымага ўзроўню», — паведамілі ў Дэпартаменце аховы навакольнага асяроддзя Нью-Джэрсі, дзе аналагічнае здарэнне адбылося ў 2012 годзе.

### Гіблае месца

Адразу пасля катастрофы жыхароў найбліжэйшага раёна эвакуіравалі, але ўжо праз два дні ім дазволілі вярнуцца назад. Агенцтва па ахове навакольнага асяроддзя ЗША (EPA) заявіла: «Назіранне за паветрам не выявіла якіх-небудзь апасенняў, якія можна было б аднесці да інцыдэнту ў цяперашні час». Улады з усіх мер па гарантаванні бяспекі толькі раяць пастарацца не выходзіць з дамоў, а пры з'яўленні прыкмет атручвання — звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Аднак у некаторых людзей, якія жывуць побач з месцам крушэння цягніка, гэтыя паведамленні выклікаюць недавер. «Не кажыце мне, што гэта бяспечна. Нешта адбываецца, калі мёртвая рыба плавае ў ручаі», — сказала мясцовая жыхарка Кэці Рыз. «Яны эвакуіравалі насельніцтва толькі ў радыусе 1 мілі ад месца здарэння, і гэта проста вар'яцтва. Мяне непакоіць доўгатэрміновае ўздзеянне на здароўе», — адзначыла Джэнна Яніяс, якая таксама паскардзілася на бесперапынны ў апошнія паўтара тыдні кашаль.

У Вашынгтоне ўпарта маўчаць аб «цягніку-бомбе» ў Агаё, хоць да



Пітсбурга — а гэта больш за трыста тысяч жыхароў — усяго 80 кіламетраў. «Нас проста супакоілі: калі вы за межамі двухкіламетровай зоны ад месца ўзгарання — з вамі ўсё ў парадку. Я жыву за сем кіламетраў і сама адчуваю, што зусім не ўсё ў парадку. Але ў цэнтральных медыя нам паўтараюць: няма ніякіх таксічных рэчываў», — кажа Эмілі Райт, прадстаўнік экалагічнага руху штата Агаё.

«Я быў вельмі ўражаны рашэннем улад так хутка дазволіць жыхарам вярнуцца ў свае дамы пасля так званага «кантраляванага падпалу асабліва небяспечных хімікатаў». Перш чым вяртаць людзей, трэба было старанна даследаваць усе жылыя памяшканні, выявіць усе рызыкі», — заўважыў эксперт па асабліва небяспечных матэрыялах Сільверада Каджыяна.

На праблемы з дыханнем, кашаль і раздражненне вачэй скардзяцца больш чым чатыры тысячы жыхароў. Яны занепакоеныя магчымым з'яўленнем ачагоў ракавых захворванняў і верагоднасцю заражэння падземных вод і студняў. «Тое, што мы выявілі падчас тэсціравання і адбору проб вады, неабходна яшчэ аналізаваць. Сапраўды, знойдзена каля трох з паловай тысячы мёртвых рыб у рацэ Агаё каля месца катастрофы. Цяпер дадаткова абследуем усе яе прыткі і іншыя водныя шляхі», — расказаў дырэктар Дэпартамента прыродных рэсурсаў штата Агаё Мэры Мерц.

Відавочна, што наступствы ўжо выйшлі за межы месца аварыі, бо пры разліве хімікатаў была атручана рака Агаё, з якой бяруць ваду каля пяці мільёнаў чалавек. Варта адзначыць, што далей Агаё ўпадае ў галоўную водную артэрыю ЗША — Місісіпі. «У ЗША 30 мільёнаў чалавек, або каля 10 працэнтаў насельніцтва ЗША, а таксама хатнія жывёлы, якія могуць быць пад пагрозай з-за наступстваў выбуху ў штаце Агаё цягніка, што сышоў з рэек і перавозіў небяспечныя хімікаты», — адзначаецца ў паведамленні тэлеграм-канала Police frequency.

### Крушэнне было непазбежным?

Доўгі час гэтая падзея не прыцягвала ўвагі вядучых амерыканскіх СМІ, піша кітайскае выданне Global Times. Медыя пачалі рэагаваць на падзею толькі больш чым праз 10 дзён пасля аварыі, а таксама пасля таго, як амерыканскі рэпарцёр быў арыштаваны за рэпартаж аб катастрофе, адзначаецца ў матэрыяле. Увесь гэты час загалоўкі вядучых амерыканскіх СМІ датычыліся нябесных аб'ектаў, так званай «кітайскай пагрозы». Пры гэтым рэальныя пагрозы бяспецы і здароўю амерыканскага народа былі адсунуты на другі план.

«Усё больш і больш людзей разумеюць, што гэта жахлівая экалагічная катастрофа. Але федэральныя дэпартаменты ЗША і мясцовыя чыноўнікі адмаўляюць гэта. Тон паведамленняў вельмі лёгкі, — адзначае Global Times. — Калі падобная падзея адбудзецца ў іншых краінах, то, хутчэй за ўсё, у рэжыме рэальнага часу з'явяцца паведамленні ад асноўных амерыканскіх СМІ. Аднак калі нешта адбываецца ў ЗША, усё становіцца іншым. Сутыкнуўшыся з гневам і моцнай незадаволенасцю мясцовага насельніцтва, Вашынгтон, які ўвесь час кажа аб «правах чалавека», «бяспецы» і «абароне навакольнага асяроддзя», здаецца абыякавым».

«Гэты кантраст ашаламляльны: амаль уся вашынгтонская эліта глядзіць на нейкіх «НЛА» на вышыні каля 10 000 метраў і кажа аб «пагрозах бяспекі», але заплюшчвае вочы на пагрозу атрутнага газу, з якой сутыкаецца іх народ... Гэта падкрэслівае сур'ёзную неадпаведнасць паміж філасофіяй бяспекі Вашынгтона і рэальнасцю. Крушэнне ў Агаё было выпадковым, але непазбежным. Згодна з данымі Федэральнага ўпраўлення чыгунак ЗША, за апошнія 10 гадоў у ЗША адбывалася ў сярэднім 3,4 аварыі на чыгунках у дзень, а вадкая нафта і хімікаты часта выцякалі і выбухалі з-за сходу цягнікоў з рэек. Гэта сведчыць аб наяўнасці сур'ёзных праблем у кіраванні перавозкай небяспечных грузаў у ЗША, што ставіць пад пагрозу бяспеку вялікай колькасці жыхароў ЗША. Аднак Кангрэс рэдка праводзіць расследаванні ў дачыненні да гэтых інцыдэнтаў», — адзначае Global Times.

«Інцыдэнт служыць трывожным званком для палітычнай эліты ЗША: іх справа — засяроддзіцца на ўнутраным кіраванні, што таксама з'яўляецца правільным спосабам пабудовы «вялікай Амерыкі». Калі канцэпцыя бяспекі не «на правільным шляху», яе праблемы з унутранай бяспекай будуць працягваць узнікаць», — рэзюмуецца ў матэрыяле.




### Рак і мутацыі

Пры гэтым адміністрацыя Байдэна практычна ігнаруе глабальную экалагічную катастрофу ў Агаё. Амаль нічога пра інцыдэнт, а галоўнае, небяспечныя наступствы, не паведамляюць і ліберальныя СМІ Злучаных Штатаў. Карыстальнікі сацсетак абурана пішуць, што амерыканскаму прэзідэнту напляваць на сваіх грамадзян, ён занадта захоплены аказаннем дапамогі Украіне ў барацьбе з Расіяй. Горад Усходняя Палесціна, штат Агаё, трэба перайменаваць у Кіеў, каб Белы дом звярнуў увагу і на яго таксама, з горкай ironiяй каментуе сітуацыю адзін з амерыканскіх інтэрнэт-карыстальнікаў.

Губернатар Агаё Марк Дэвайн заявіў, што тысячы людзей у яго штаце могуць загінуць. Аднак так і не назваў тое, што адбылося, надзвычайнай сітуацыяй. Сваю версію абыякавасці амерыканскіх улад да трагедыі ў Агаё выказаў Такер Карлсан. Тэлевядучы Fox News лічыць, што прэзідэнта Байдэна і дэмакратаў зусім не хвалюе лёс «белых жыхароў Усходняй Палесціны, якія галасавалі за Трампа».

Эксперты выказалі здагадку, што крушэнне складу ў Агаё (далёка не першае) адбылося з-за састарэлых тармазных сістэм чыгуначнага рухомага саставу, тэхналогія якіх у ЗША не мянялася дзесяцігоддзямі. У 2012 годзе цягнік з вінілхларыдам сышоў з рэек у Нью-Джэрсі, што заахвоціла адміністрацыю Абамы перагледзець парадак транспарціроўкі і класіфікацыі асабліва небяспечных матэрыялаў. Але ў перыяд праўлення Трампа лабісты хімічнай і чыгуначнай галіны здолелі спыніць працэс прыняцця гэтых нававўядзенняў, каб не выдаткоўваць на мадэрнізацыю грошы.

Вядучы Fox News Джэсі Уотэрс заклікаў Байдэна ўвесці рэжым надзвычайнага здарэння з-за хімічнай катастрофы ў Агаё. «Цягнік сыходзіць з рэек, яны падпальваюць яго, гэта, верагодна, выкліча ва ўсіх рак. У іх заражаная ўся рака Агаё. Гэтыя хімікаты цякуць уніз па цячэнні ў Заходнюю Вірджынію, і мы не аб'явілі надзвычайнае становішча ў краіне. Мы аб'явілі надзвычайнае становішча ў краіне з-за воспы малпаў, а тут — не?» — абурыўся Уотэрс. Як заўважыў амерыканскі тэлевядучы, крушэнне цягніка можа прывесці да кіслотных дажджоў і гібелі ўсёй рыбы ў рацэ штата Агаё. Ён таксама дадаў, што ўлады патуралі ўтойванню доказаў на «месцы злачынства», дазволіўшы знішчэнне хімікатаў.

Пэн Індэн, эксперт з цэнтральнага ўрадавага цэнтра па наглядзе за ахowай навакольнага асяроддзя і надзвычайнымі сітуацыямі Кітая, паведаміў СМІ, што вінілхларыд лёгка запальваецца, пры гарэнні выдзяляюцца вуглякіслы газ і саляная кіслата. Апошняя ў спалучэнні з ападкамі выкліча кіслотныя дажджы і зробіць зямлю непрыдатнай для апрацоўкі. Калі вінілхларыд не згарыць цалкам, ён вылучыць больш таксічных дыяксінаў і фасгену. Па словах Пэна, дыяксіны вельмі цяжка раскладаюцца натуральным шляхам, і, як толькі яны пранікаюць у глебу, могуць заставацца там дзесяцігоддзямі. Эксперт адзначыў, што збожжа, вырашчанае на гэтай глебе, выкліча рак і мутацыі ў людзей.

«Нам трэба будзе сутыкнуцца з наступствамі праз 5, 10, 15 і 20 гадоў, калі могуць узнікнуць кластары анкалагічных захворванняў або раптам сапсавацца калодзежная вада», — заявіў у эфіры тэлеканала FOX21News амерыканскі эксперт па хімічных рэчывах і небяспечных матэрыялах Сільверада Каджыяна. Спецыяліст заўважыў, што жыхары Усходняй Палесціны павінны прайсці медыцынскае абследаванне як мага хутчэй.

**Захар БУРАК.**

# ВЕДЫ ПЛЮС АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

## Якасць, а не колькасць

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА,** які прыняў удзел у калегіі, заўважыў у сваім выступленні, што ўзмацненне ўвагі да праблем адукацыі з'яўляецца характэрнай рысай развіцця сусветнай супольнасці ў апошнія дзесяцігоддзе.

— Адукаваны чалавек — той, які здольны самастойна засвойваць новыя веды — становіцца найважнейшай каштоўнасцю і асноўным капіталам сучаснага грамадства. Натуральна, што ў свеце разгарнулася сур'ёзная канкурэнцыя і барацьба за гэты капітал. І мы, як ніхто іншы, адчуваем гэта кожны дзень, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. — Сістэма адукацыі ў сваім развіцці, вядома, павінна ўлічваць сусветныя тэндэнцыі, у той жа час дзяржаўныя інтарэсы і ўласныя нацыянальныя асаблівасці з'яўляюцца для нас прыярытэтнымі.

«Неад'емнай часткай адукацыйнага працэсу з'яўляецца выхаваўчая і ідэалагічная работа. Мы, акрамя ведаў, павінны даць моладзі і жыццёвыя арыенціры. Таму на першы план выходзіць фарміраванне светапоглядных асноў навучэнцаў, выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму, — дадаў Ігар Петрышэнка. — Ва ўстановах адукацыі ўжо склалася сістэма выхаваўчай і ідэалагічнай работы, разам з тым актуальны парадак дня патрабуе новых сучасных падыходаў да яе арганізацыі. У сувязі з гэтым Міністэрству адукацыі трэба звярнуць асаблівую ўвагу на прафесійную кампетэнтнасць і асабістую пазіцыю арганізатараў выхаваўчага працэсу. Немагчыма пераацаніць уплыў на навучэнца настаўніка, выкладчыка, выхавальніка, якія штодня працуюць у класе ці ў аўдыторыі і з'яўляюцца праваднікамі асноў дзяржаўнай ідэалогіі.

— Адукоўвацы мы навучыліся, а вось да выхаваўчай работы ёсць пытанні. Не заўсёды колькасць мерапрыемстваў пераходзіць у якасць, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ.** — Мы аналізавалі планы выхаваўчай работы ў некаторых установах адукацыі. Іх часам столькі, што ў дзяцей проста няма часу «прадыхнуць». Давайце ўсё ж такі зробім выхаваўчую работу больш мэтанакіраванай і практыка-арыентаванай.

## Нюансы выхавання

— Выхаваўчая работа — вялікая, шматгранная, усёабдымная справа. І сваю мэту мы бачым у тым, каб аб'яднаць разрозненыя ініцыятывы ў цэласную сістэму, дасягнуць адзінства ўсіх сацыяльных інстытутаў у пытаннях выхавання, — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** — З гэтай мэтай распрацаваны індэкс эфектыўнасці дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, які ўключае вывучэнне якасці нацыянальнай сістэмы адукацыі, падрыхтоўкі кадраў, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне моладзі, занятасць, здароўе, захаванне сямейных каштоўнасцяў



і падтрымку маладой сям'і, удзел моладзі ў грамадска-палітычным жыцці краіны і іншыя пазіцыі.

Гаворачы аб якасці работы ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, мы арыентуемся не толькі на той аб'ём ведаў і ўменняў, якім валодае наш выпускнік, але і на тое, каб са сцен школы выйшаў чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, які прыносіць карысць сваёй краіне.

Міністэрства адукацыі цесна супрацоўнічае з МУС і Міністэрствам абароны. На тэрыторыі воінскіх часцей арганізаваны і актыўна дзейнічаюць 39 ваенна-патрыятычных клубаў.

Важкі ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны ўносяць пошукавыя аб'яднанні. Сёння ў 372 пошукавых аб'яднаннях займаюцца амаль 4,5 тысячы навучэнцаў.

Папаўняюцца экспазіцыі школьных музеяў, праводзіцца работа па абнаўленні іх сайтаў, арганізацыі музейнай даследчай дзейнасці. Ва ўстановах адукацыі функцыянуе 1420 музеяў, у тым ліку 209 — ваенна-гістарычнага профілю. З 2022 года ў школах арганізавана 2011 музейных экспазіцый, прысвечаных ахвярам генацыду беларускага народа.

Лічу своечасовым увядзенне летась у школах, а сёлета ў каледжах пасады кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні. Міністэрствам адукацыі праведзена неабходная арганізацыйная і інфармацыйна-метадычная работа. Кіраўнікам па ваенна-патрыятычным выхаванні дадзена права выконваць у рабочы час аплатную педагагічную дзейнасць у частцы рэалізацыі адукацыйных праграм. Сёння ўстановамі адукацыі сумесна з ваенкаматамі працягваецца работа па падборы кадраў на гэтую пасаду.

На думку міністра, правільна выбудаваная інфармацыйна-тлумачальная работа — яшчэ адзін важны складнік выхавання. У апошнія некалькі гадоў ва ўстановах адукацыі рэалізоўваецца інфармацыйна-адукацыйны праект «Школа актыўнага грамадзяніна». У навучэнцаў выклікаюць непадробную цікавасць у фармаце адкрытага дыялогу зносіны з кіраўнікамі дзяржаўных органаў улады, сілавых ведамстваў, дэпутатамі. «Гэта фарміруе ў іх паспяховасць, мэтанакіраванасць, пазітыўнае стаўленне да жыцця, — лічыць кіраўнік адукацыйнага ведамства. — Новай формай арганізацыі выхаваўчай работы стаў адкрыты дыстанцыйны марафон праектаў «Мы дзейнічаем!». З мэтай яго рэалізацыі на нацыянальным адукацыйным партале адкрыта інтэрнэт-пляцоўка, дзе настаўнікам, навучэнцам, усім зацікаўленым даецца магчымасць падзяліцца вопытам рэалізацыі сацыяльных праектаў і ініцыятыў, а таксама ўнесці прапановы па ўдзеле ў грамадскім жыцці свайго рэгіёна».

## Электронная «чарга» ў дзіцячы садок

Асобна ўдзельнікі калегіі спыніліся на пытанні даступнасці дашкольнай адукацыі. «У 2022 годзе доля дзяцей ад 1 да 6 гадоў, якія атрымліваюць дашкольную адукацыю, дасягнула амаль 90 працэнт, — праінфармаваў міністр. — Упершыню магчымасць атрымліваць дашкольную адукацыю дома была дадзена дзецям, якія па медыцынскіх паказаннях пастаянна не могуць наведваць установу дашкольнай адукацыі.

Паводле звестак сацыялагічнага апытання, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ў верасні мінулага года, каля 95 % апытаных бацькоў без праблем атрымалі месца менавіта ў тым дзіцячым садку, у які хацелі.

Разам з тым у Мінскім раёне паранейшаму захоўваецца дэфіцыт месцаў у дзіцячых садках па месцы жыхарства. Мы працуем над сістэмай, якая дазволіць бацькам ажыццяўляць працэдуру пастаноўкі дзіцяці на ўлік у электроннай форме праз адзіны партал электронных паслуг. Была арганізавана работа па візуалізацыі інфармацыі аб наяўнасці свабодных месцаў у кожнай установе дашкольнай адукацыі ў рэгіёнах. На інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі, сайтах аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама размешчаны інтэрактыўныя карты са спасылкамі на ўсе ўстановы дашкольнай адукацыі рэгіёнаў і Мінска».

— У пытанні павышэння даступнасці дашкольнай адукацыі шмат зроблена, — паведаміў Ігар Петрышэнка. — Толькі за апошні год пабудавана 12 дзіцячых садкоў больш чым на дзве тысячы месцаў. І ў той жа час у асобных мікрараёнах з інтэнсіўнай жылой забудовай захоўваецца актуальнасць з месцамі ў дашкольных установах крокавай даступнасці. Заўважу, што агульная колькасць месцаў у садках перавышае колькасць дзяцей. Так, у Мінску на тысячу дзяцей дашкольнага ўзросту ў дашкольных установах ёсць 1100 месцаў. Таму мы працягнем практыку выдзялення месцаў у дашкольных установах, якія размешчаны побач з працай бацькоў малых або па дарозе да месца іх працы. Будзе арганізаваны падвоз дзяцей з мікрараёнаў да дзіцячых садкоў, дзе ёсць свабодныя месцы. Зыходзячы з гэтых падыходаў, неабходна на мясцовым узроўні распрацаваць лагістыку і весці прадметную індывідуальную работу з бацькамі. Трэба яшчэ раз праінвентарызаваць усю сетку дзіцячых садкоў у рэгіёнах. Вельмі важная гібкасць кіравання на месцах. Пры гэтым новыя дашкольныя ўстановы мы працягнем будаваць....

Сёлета павінна быць уведзена ў эксплуатацыю электронная сістэма пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу ў дзіцячым садку. Спадзяёмся, што яна значна спросціць працэс забеспячэння дзіцяці месцам у дашкольнай установе...

## Зона адказнасці для ўсіх

Сур'ёзным экзаменам стане правядзенне ў маі бягучага года атэстацыі выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ў новым фармаце.

— Рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену паказала, што сур'ёзных праблем з яго арганізацыяй няма. Але ў той жа час, паважаныя калегі, хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што ніякіх недапрацаваных «дробязяў» у гэтым пытанні быць не павінна. Асабліва падкрэслю, што экзамен — зона адказнасці для ўсіх: ад міністра да кіраўніка кожнай установы адукацыі. Пільную ўвагу трэба ўдзяліць пытанням бяспекі, зладжаным дзеянням мясцовых органаў кіравання адукацыяй, аховы здароўя, праваахоўчых органаў і МНС, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Абмяркоўваючы тэму якасці адукацыі, Андрэй Іванец паведаміў, што **Міністэрствам адукацыі прынята рашэнне аб правядзенні з гэтага года нацыянальнага даследавання па функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.** Гэта будзе комплексная работа, якая ўключае заданні па чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай і фінансавай адукаванасці.

— У даследаванні прымуць удзел каля 20 тысяч навучэнцаў дзясятых класаў з усіх рэгіёнаў. Яго вынікі дазволяць вызначыць шэраг задач, над якімі нам трэба будзе працаваць у найбліжэйшай перспектыве, — патлумачыў кіраўнік галіны. — У першую чаргу, гэта датычыцца ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу. Заданні, накіраваныя на прымяненне навучэнцамі засвоеных ведаў, уменняў і навыкаў у розных жыццёвых сітуацыях, павінны знайсці адлюстраванне ў кампанентах вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных прадметах. Задача Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, інстытутаў развіцця адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі — правесці семінары па ўдасканаленні методык навучання вучэбным прадметам з выкарыстаннем гэтых матэрыялаў.

Важная задача — фарміраванне высокапрафесійнага экспертнага патэнцыялу ў галіне ацэнкі якасці адукацыі. Адпаведная задача пастаўлена Нацыянальнаму агенцтву па забеспячэнні якасці адукацыі.

У верасні бягучага года ў краіне адбудзецца фінал Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». Ён праводзіцца раз на тры гады. Адначасова з адборачнымі турамі конкурсу «Настаўнік года» ў краіне праходзіць рэспубліканскі фестываль «Педагагічны дэбют», у якім удзельнічаюць педагагічныя работнікі ва ўзросце да 31 года са стажам работы на пасадзе не больш за пяць гадоў. Плануецца зрабіць яго таксама рэгулярным.

## Прэстыж прафесіі і сацыяльны статус

Міністр адукацыі ўпэўнены ў тым, што якасць сучаснай адукацыі вызначаецца не толькі яе зместам і адукацыйнымі тэхналогіямі, але і гуманістычнай накіраванасцю. «Ад узроўню культуры, маральных каштоўнасцяў, прыстойнасці, дабрыні і іншых чалавечых якасцяў не толькі педагогаў, але ўсіх, хто мае дачыненне да сістэмы адукацыі, залежаць характары, лёсы, а часам і жыцці соцень і тысяч дзяцей, — звяртае ўвагу ён. — І кожны, нават адзінкавы выпадак невыканання настаўнікам ці выкладчыкам этычных нормаў негатыўна ўплывае на фарміраванне новага пакалення, на сацыяльны статус педагога і на прэстыж педагагічнай прафесіі ў цэлым.

Грамадства патрабуе ад педагагічных работнікаў як выканання ўласна прафесійных функцый па навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення, так і высокіх маральных якасцяў. Прыемна адзначыць, што добрых педагогаў у нас большасць. Мы шануем іх працу. Аднак у мінулым годзе званне заслужанага настаўніка атрымаў толькі адзін чалавек, заслужанага работніка адукацыі — трое, а народнага настаўніка — увогуле ніхто. Лічу, мы недапрацоўваем у гэтым пытанні. Трэба больш актыўна ўносіць прапановы па ўзнагароджанні заслужаных педагогаў».

— Летась было прынята рашэнне аб ліцэнзаванні практычна ўсіх устаноў адукацыі. Гэта яшчэ адзін інструмент для ўзмацнення адказнасці кіраўнікоў і ўстаноў адукацыі за вынікі іх дзейнасці, — паведаміў Ігар Петрышэнка. — Майце на ўвазе, што ліцэнзаванне і акрэдытацыя не павінны зводзіцца да падпісання фармальных аб'ёмных справаздач. Такія праверачныя мерапрыемствы павінны стаць стымулам у развіцці ўстаноў адукацыі і іх дзейнасці, спрыяць устараненню ўсіх пралікаў. Прашу міністра звярнуць асаблівую ўвагу на кантрольную дзейнасць. Лічу, што гэта работа павінна быць якасна абноўлена.

Ігар Петрышэнка таксама спыніўся на эфектыўнасці работы метадычных арганізацый: «Іх штат немалы. Аднак мушу канстатаваць, што дзеючая сістэма метадычнага суправаджэння сістэмы адукацыі патрабуе ўдасканалення. Неабходна перагледзець як яе структуру, так і функцыі метадычных арганізацый, — падкрэсліў ён. — Такая задача пастаўлена на бягучы год урадам перад Міністэрствам адукацыі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

# ДАЛЁКІ

## У чым сакрэт поспеху прадпрыемства «НТЦ «ЛЭМТ»,



Зборку прыцэлаў выконвае слесар механазборачных работ Мікіта БРУЙЛО.

**Навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» БелОМА» спецыялізуецца на даследаванні, распрацоўцы і вытворчасці оптыка-электронных прыбораў рознага прызначэння, у тым ліку і медыцынскага профілю. Прадукцыя прадпрыемства выкарыстоўваецца ў калійных шахтах Салігорска (падземнымі камбайнамі кіруюць з дапамогай лазерных сістэм вытворчасці ЛЭМТ) і цэхах аднаго з найбуйнейшых вытворцаў шыннай галіны — «Белшына»; яго сістэмы ахоўваюць дзяржаўную граніцу нашай краіны. Сёлета спецыялісты прадпрыемства пачалі супрацоўнічаць з беларускім алмазаапрацоўчым прадпрыемствам «Крышталь». Аднак пераважная большасць прадукцыі накіроўваецца на экспарт, прычым у краіны далёкага замежжа. Летась ва ўмовах санкцыйнага ціску прадпрыемству ўдалося нарасціць экспарт на 42 %. А на бягучы год сфарміраваны яшчэ больш важкі партфель заказаў.**



Дырэктар НТЦ «ЛЭМТ» БелАМА, акадэмік НАН Рэспублікі Беларусь, член-карэспандэнт НАН Рэспублікі Беларусь Аляксей ШКАДАРЭВІЧ.

## Пераадолець звышгукавы бар'ер

У савецкія часы БССР быў вядомы сваімі распрацоўкамі ваенных аптычных прыбораў і оптаэлектронных сістэм. Праз 10 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску пачалося будаўніцтва завода № 941, які пасля стаў вядомым мінскім механічным заводам імя Вавілава, яшчэ пазней быў рэарганізаваны ў БелОМА (Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне). Апроч традыцыйнай оптыка-механічнай прадукцыі, тут асвойвалі вытворчасць інфрачырвонай тэхнікі, сродкаў саманавядзення, касмічнай арыентацыі, у тым ліку і для Узброеных Сіл. Але саюз распаўся, і разам з гэтым знікла дзяржаўнае фінансаванне, самастойна варта было шукаць рынкі збыту, заказчыкаў, пастаўшчыкоў камплектуючых. Аднак застаўся інтэлектуальны і навуковы патэнцыял і энтузіясты. Менавіта яны ў такіх няпростых умовах у маі 1992 года шляхам структурнай рэарганізацыі аднаго з падраздзяленняў Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання і стварылі «НТЦ «ЛЭМТ» БелОМА».

— Умовы былі складаныя. Па-першае, увесь знешні гандаль Савецкага Саюза ішоў праз Маскву. У Беларусі не было ні вопыту, ні кадраў, ні разумення, як гэта ўсё працуе, — кажа нязменны **кіраўнік прадпрыемства, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Аляксей Пятровіч ШКАДАРЭВІЧ.** — Па-другое, калі мы працавалі на ўнутраны рынак, як ваенны, так і не ваенны, такое паняцце, як экстэр'ер вырабу, знешні выгляд, нікога не хвалявала, а такіх спецыялістаў, як дызайнер, не было на прадпрыемстве. Зразумела, усё гэта — звышгукавы бар'ер для нас на той час. А самае галоўнае, што мы прачнуліся ў незалежнай Беларусі, калі практычна засталіся без цэнтралізаванага фінансавання. Раней сродкі выдзяляла Масква, наша задача была — зрабіць. А тут з'явіўся шэраг праблем: як і за што распрацаваць і зрабіць, каму прадаць.

**У медустановах маецца шмат распрацовак «НТЦ «ЛЭМТ», сярод іх, напрыклад, лазерны скальпель «Diolas 940-6», прылада для візуалізацыі падскурных вен «Vmash», апарат для лячэння атыту «Антыатыт».**

У гісторыі прадпрыемства няпростыя часы былі неаднойчы, аднак з цяжкасцямі тут умела спраўляліся. Сёння «НТЦ «ЛЭМТ» распрацоўвае і вырабляе аптычныя прыцэлы (тэлескапічныя, лазерныя, каліматарныя, начныя, цеплавізійныя, інтэлектуальныя, а таксама іх камбінацыі), лазерныя дальнамеры і дальнамерныя модулі на аснове дыёдных лазераў, лазераў з дыёдный напампоўкай і лазераў з бяспечнай даўжынёй хвалі выпраменьвання дыяпазонам вымярэння да 40 км, оптыка-электронныя прыборы для беспілотных лятальных апаратаў, лазерна-аптычныя комплексы для сістэм супрацьпаветранай абароны, комплексныя сістэмы бяспекі і аховы граніцы, лазерную медыцынскую тэхніку, кантрольна-вымяральнае і стэндавае абсталяванне для аптычнай вытворчасці.

## Экспарт — у 81 краіну свету

Мінулы год «НТЦ «ЛЭМТ» скончыў з добрымі паказчыкамі. Толькі рост экспарту склаў 42 %.

— Як вядома, мінулы год прайшоў пад жорсткімі санкцыямі. Не магу пагадзіцца з тымі, хто кажа, што санкцыі толькі на карысць. Для нас яны вельмі балючыя, бо экспарт складае да 90 % нашых аб'ёмаў вытворчасці. У структуры экспарту 93 % — гэта далёкае замежжа, і толькі 7 % — Расія. Таму праблемы вострыя. Аднак пры тым, што ўмовы былі горшыя, нам удалося за мінулы год нарасціць экспарт на 42 %. Гэта далося цяжка, і год мы прайшлі з вялікімі перагрузкамі, — кажа Аляксей Шкадарэвіч.

За 30-гадовую гісторыю прадпрыемства яго прадукцыя пастаўлялася ў 81 краіну свету. Апошнім часам у экспартным партфелі «НТЦ «ЛЭМТ» з'явіліся нават такія экзатычныя краіны, як Філіпіны, Гана, Інданезія, М'янма, Паўднёвая Карэя, Тайланд.

— Летась сваю прадукцыю мы пастаўлялі ў 25 краін свету. З'явіліся і новыя экспартныя напрамкі, у прыватнасці мы моцна выраслі ў Паўднёва-Усходняй Азіі, — адзначае дырэктар.

Адзін са спосабаў прадставіць сваю прадукцыю, у тым ліку і новую, — удзел у міжнародных выставах. Толькі летась прадстаўнікі ЛЭМТ пабывалі ў В'етнаме, Малайзіі, Інданезіі, Паўднёвай Афрыцы, на Блізкім Усходзе, краінах СНД. Прычым, тут упэўнены, што ехаць варта не туды, дзе ўжо ёсць цікавасць да прадукцыі, а пастаянна заваёўваць новыя рынкі.

— Мы едзем некуды, і там з'яўляецца цікавасць да нашых вырабаў, а не наадварот. Мы самі ствараем гэту цікавасць. Іншая справа, што нас цяпер шмат дзе ведаюць, паколькі наша экспартная геаграфія ўключае 81 краіну. Мы вязём новую прадукцыю, якая ў нас з'явілася і пакуль шырока не вядомая. Пастаянныя заказчыкі сочаць за нашымі навінкамі, але важна шукаць і новыя рынкі, — упэўнены Аляксей Шкадарэвіч.



Начальнік сектара Віктар СТАСІЛОВІЧ за стэндам настройкі і кантролю інфармацыйных каналаў.

## Як выявіць квадракоптар?

У шэраг краін пастаўляецца распрацоўка «НТЦ «ЛЭМТ» — оптыка-электронны і радыёлакацыйны комплекс кантролю наземнай і паветранай абстаноўкі «Зоркі». Менавіта ён ахоўвае і беларускую граніцу.

Сёння выяўленне маленькіх беспілотнікаў — актуальная праблема. Дроны, якія прадаюцца на рынку, кожны можа купіць і выкарыстоўваць у розных мэтах. «Зоркі» дазваляе весці візуальнае выяўленне і распазнанне ў маштабе рэальнага часу цэль тыпу «чалавек, транспартныя сродак, беспілотны лятальны апарат (БПЛА), прычым як у дзённы, так і ў начны час і пры любых умовах надвор'я. Тэлевізійная або цеплавізійная карціна мясцовасці перадаецца на аўтаматызаванае працоўнае месца, прычым з вымярэннем адлегласці і вызначэннем каардынат цэлі. Пры гэтым сістэма дазваляе распазнаць чалавека на адлегласці да сямі кіламетраў, аўтамабіль — да 14, БПЛА — 5. «Зоркі» стаў першым комплексам такога класа ў Беларусі.

— Сістэма ўнікальная тым, што працуе па наземных цэлях, а гэта складана забяспечыць, асабліва ў работу ў радыёлакацыйным дыяпазоне. Для радыёлакатараў на зямлі шмат перашкод: сканавальны прамень «чапляецца» за кусты, за нерухомыя і рухомыя цэлі, — тлумачыць кіраўнік прадпрыемства. — Гэта каласальная задача для матэматыкаў і праграмістаў, і яна была вырашана.

Пастаўка аптычных прыбораў і сістэм для айчынных сілавых структур — ніша, якую цяпер, ва ўмовах ускладнення лагістычных паставак, заняло прадпрыемства.

— У Беларусі гэта сітуацыя арганамі кіравання была загадзя пралічана. Пяць гадоў таму, калі быў поўны дабрабыт і оптыку для сілавых ведамстваў можна было набываць усюды, апаратыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце паставіў задачу заняцца гэтым кірункам. І мы яе выканалі, — адзначае Аляксей Шкадарэвіч. — Сёння мы маем дзяржзаказ на больш чым 30 мільёнаў рублёў на вырабы для шасці сілавых ведамстваў Рэспублікі Беларусь. Мы цалкам забяспечваем імпартазамяшчэнне, прычым вырабамі, якія па якасці не горшыя, чым набываліся раней. І гэта вялікі для нашага прадпрыемства заказ.



Інжынер-даследчык Аляксандр БАБКО і оптык-механік Уладзімір ОСІПАЎ праводзяць наладку і юсціроўку дальнамераў.

# ПРЫЦЭЛ

## якое экспартуе да 90 % сваёй прадукцыі?






Наладчыку станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем Уладзіміру ПЕРШЫНУ даручана сучаснае металаапрацоўчае абсталяванне. Ён вырабляе дэталі з асабліва высокай дакладнасцю.

## Для лячэння вен, атытаў і злаякасных пухлін

Вырашаюць задачу імпартазамяшчэння і пастаўкі медыцынскага абсталявання на аснове паўправадніковых лазерных дыёдаў. З сістэмай аховы здароўя прадпрыемства супрацоўнічае даўно, у медустановах маецца шмат распрацовак «НТЦ «ЛЭМТ», сярод іх, напрыклад, лазерны скальпель «Diolas 940-6», прылада для візуалізацыі падскурных вен «Vmash», апарат для лячэння атыту «Антыатыт».

Адна з самых папулярных распрацовак — лазерны хірургічны дыёдны апарат «Diolas 940-6» — так званы лазерны скальпель. Ён выкарыстоўваецца для аператыўных умяшанняў у стаматалогіі, дэрматалогіі, касметалогіі, анкалогіі, гінекалогіі, сківічнатварнай хірургіі, нейрахірургіі. У выніку пасля аперацыі застаюцца мінімальна траўматычныя разрэзы, рана хутчэй загойваецца, а хваравітасць і запаленчая рэакцыя ў пасляаперацыйным перыядзе мінімальныя.

У апошнія гады набыло папулярнасць ужыванне лазераў сумесна з фотадынамічнай тэрапіяй (ФДТ) пры лячэнні злаякасных наватўтварэнняў шэрагу лакалізацый. З нядаўняга часу распрацаваная для гэтых мэт паўправадніковая лазерная прылада «УПЛ-ФДТ» выкарыстоўваецца не толькі пры правядзенні антыбактэрыяльнай фотатэрапіі ў стаматалогіі, гінекалогіі, лячэнні гнойных і апёкавых ран, пры сасудзістых паталогіях вочнага дна, але і ў анкалогіі. Пасля ўвядзення ў арганізм пацыента айчыннага фотасенсібілізатара «Фаталон», які назапашваецца ў пухліне і пад дзеяннем лазернага святла актывуецца, пухліна разбураецца ў выніку фотахімічнай рэакцыі.

Новы пераносны апарат «УПЛ-ФДТ-3» для стаматалогіі па габарытах параўнальны з фотапалімерызатарам. Дзякуючы камплекту зменных насадак яго можна ўжываць пры самых розных аперацыях. Ён выкарыстоўваецца для дэзынфекцыі поласці рота і зубных каналаў, стымулюе гаенне ран і эразіўна-язвавых пашкоджанняў у поласці рота, валодае супрацьзапаленчым дзеяннем.

Адной з найноўшых распрацовак ЛЭМТ з'яўляецца фізіятэрапеўтычны апарат «Антыатыт». Ён ужываецца для лячэння лёгкіх і сярэдніх формаў атыту — запалення вуха. Апарат дастаткова просты і складаецца з блока кіравання і навушнікаў, якія выкарыстоўваюцца для прагравання вушных каналаў інфрачырвоным выпраменьваннем.

Прылада для візуалізацыі вен «Vmash» — гэта партатыўны аўтаномны прыбор вагой усяго каля 100 г, які нагадвае камп'ютарную мыш. Апарат распрацаваны ў дапамогу медыцынскаму персаналу: ён дазваляе раўнамерна асвятляць асобныя ўчасткі скуры і падскурнай тканкі і можа быць выкарыстаны для лячэння паверхневага варыкознага расшырэння вен, дапамагае ў пошуку вены ў праблемных пацыентаў пры заборы крыві для аналізу.



Фінальны этап перад адпраўкай гатовых вырабаў для начнога бачання — чыстка оптыкі.

**За 30-гадовую гісторыю прадпрыемства яго прадукцыя пастаўлялася ў 81 краіну свету. Апошнім часам у экспартным партфелі «НТЦ «ЛЭМТ» з'явіліся нават такія экзатычныя краіны, як Філіпіны, Гана, Інданезія, М'янма, Паўднёвая Карэя, Тайланд.**



Сістэму комплексу назірання за мясцовасцю настройвае начальнік аддзела Аляксандр АНДРЫЕНКА.

## Акадэмік і дырэктар у адной асобе

Прадпрыемства пастаянна развіваецца, павялічваючы вытворчасць і наменклатуру прадукцыі. Сёння тут працуе больш чым 350 чалавек. Інжынерныя кадры папаўняюць за кошт выпускнікоў БНТУ, БДУ, БДУІР. Акадэмік Шкадарэвіч узначальвае дзяржаўныя камісіі па размеркаванні ў БДУ і БНТУ, супрацоўнікі прадпрыемства — члены камісіі ў БДУІР.

— Мы пачынаем працаваць са студэнтамі з другога курса, залічваем іх у штат. Так яны прыглядаюцца да прадпрыемства, а прадпрыемства — да іх, — дзеліцца суразмоўнік.

Дзякуючы гэтаму і атрымліваецца стварыць маладую і баяздольную каманду. Кожны трэці супрацоўнік маладзейшы за 30 гадоў. І моладзь робіць вырашальны ўнёсак у сумесны поспех.

Аляксей Шкадарэвіч узначальвае «НТЦ «ЛЭМТ» з моманту яго стварэння — ужо больш як 30 гадоў (і гэта, дарэчы, адзіны прыклад у Беларусі, калі акадэмік кіруе вытворчым прадпрыемствам). Дагэтуль працаваў на БелОМА — з 1979 года быў начальнікам Міжгаліновага канструктарскага аддзела. У 1988 годзе абараніў доктарскую дысертацыю, прычым зрабіў гэта не ў Мінску, а ў Дзяржаўным аптычным інстытуце імя С. І. Вавілава ў Ленінградзе, вучоны савет якога вызначаўся надзвычайнай патрабавальнасцю да навуковых работ. У 2000-м стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за цыкл прац «Механізмы развіцця, метады і сродкі лячэння глаўкомы, катаракты, фотапашкоджанняў сятчаткі вока». У 2015 годзе Аляксей Пятровіч узнагароджаны беларускім ордэнам Пашаны, у 2021-м — ордэнам Айчыны III ступені, у 2022-м — нагрудным знакам адрознення імя У. М. Ігнатоўскага НАН Беларусі. З'яўляецца аўтарам больш чым 450 навуковых прац, у тым ліку сямі манаграфій, 3 навучальных дапаможнікаў, мае звыш 120 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў.

Цікавімся, як у свеце сучасных тэхналогій, дзе ўсё імкліва мяняецца, удаецца паспяхова развіваць прадпрыемства, штогод прырастаючы ў аб'ёмах вытворчасці і наменклатуры прадукцыі.

— Бесперапынна, 24/7, думаць — за сябе і часам за іншых, — кажа Аляксей Пятровіч. — У мяне часта пытаюць пра ролю акадэміка як дырэктара прадпрыемства, маўляў, навошта гэта патрэбна? Таму што цяпер запатрабаваны людзі не проста кампетэнтныя — сёння трэба мець здольнасць бачыць не толькі тое, што было і ёсць, а зазірнуць за гарызонт. Вядома, у гэтым мне дапамагае калектыў. На прадпрыемстве 33 % супрацоўнікаў маладзейшыя за 30 гадоў, а 15 % — старэйшыя за 55 гадоў. І гэта людзі, якія прыходзяць у наш калектыў не для таго, каб спакойна дачакацца пенсіі, а каб тварыць. Яны носьбіты і традыцый, і ведаў, і інтэлекту. А на іх прыкладзе расце моладзь. І гэта адзін са складнікаў поспеху, — рэзюмуе суразмоўнік.

І метафарычна дадае, што жыццё — гэта ровар.

— Ты едзеш, пакуль круціш педалі. Як толькі перастаў гэта рабіць, ровар падае. Таму даводзіцца ўвесь час імкнуцца наперад.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 100230590

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел. +375 (232) 71-38-55 в лице антикризисного управляющего Костяна Дмитрия Александровича.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **06 марта 2023 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Имущество филиала «Пиревичский спиртзавод» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., Жлобинский р-н, аг. Пиревичи, ул. Суворова, 4А | 2 076 639,70 |
| 2 | Имущество филиала «Рогачевский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Богатырева, 36 | 21 303,38 |
| 3 | Имущество филиала «Речицкий» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Речица, ул. Винзаводская, 4 | 177 706,90 |
| 4 | Имущество филиала «Чечерский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 72А | 24 154,21 |

Подробнее с составом лотов можно ознакомиться на сайте beltorgi.by. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.02.2023 г. 09.00 по 03.03.2023 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газетах «Звязда», «Гомельская правда» от 29.12.2022 г.

## ОАО «Управление механизации № 91»

**извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 17 марта 2023 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.**

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлению документа, удостоверяющего личность.

| ПОВЕСТКА ДНЯ |
|---|
| 1. Об итогах работы финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2022 году и основных направлениях деятельности Общества на 2023 год |
| 2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2022 году |
| 3. Отчет о работе ревизионной комиссии в 2022 году |
| 4. Рассмотрение результатов ежегодной ревизии по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2022 год. Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2022 год |
| 5. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества и направлений использования чистой прибыли Общества за 2022 год. Утверждение дивидендов за 2022 год |
| 6. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2022 год. О направлениях использования чистой прибыли и периодичности выплаты дивидендов по результатам деятельности общества в 2023 году. |
| 7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии |
| 8. Об установлении вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества |

УНП 100551130

**Тел. 8 (017) 337-65-80.**

***Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»***

**Учитывая сложную эпидемиологическую обстановку, просим соблюдать масочный режим либо по всей интересующей информации обращаться по тел. 337 65 80.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### ИНФОРМИРУЕТ о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу

**Аукцион состоится 21.03.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | **ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 431/С-13343 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 11,7 кв. м,** расположенное по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 7А. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355700001001106, площадью 0,0066 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина) по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 7А |
| Начальная цена продажи | 20 000 руб. (двадцать тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2000 руб. (две тысячи рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 17.03.2023 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества Мстиславского РАЙПО

**Аукцион состоится 21.03.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис организатора аукциона)**

Лот № 1 – Право заключения договора аренды капитального строения **с инв. № 723/С-6902 – магазин «Книги».**

Адрес: Могилевская обл., г. Мстиславль, ул. Калинина, д. 29, общ. пл. 83 кв. м. Срок заключения договора аренды – 1 год. Здание имеет статус историко-культурной ценности.

***Начальная цена – арендная плата в месяц за объект: 50 б.а.в (на 01.02.23 – 845,00 бел. рублей). Сумма задатка: 338,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 20.03.2023 до 11.00. В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона Победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка. Победитель аукциона обязан в течение 5 рабочих дней со дня оплаты предмета аукциона подписать договор аренды помещений. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

29.03.2023 г. в 12.00 состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2022 год и основных направлениях деятельности общества в 2023 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2022 г.
4. Об утверждении распределения прибыли общества по итогам деятельности за 2022 г., о выплате дивидендов за 2022 г.
5. Об утверждении основных направлений использования прибыли в 2023 году и первом квартале 2024 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания – с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра – 01.03.2023 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 09.03.2023 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200050191

Наблюдательный совет.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 137

**с инв. № 620/С-44204 общей площадью 178,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250600001002224** ***(право аренды по 01.08.2121)*** **площадью 0,0343 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Чапского, 17**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 135 375,74** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **13 537,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169З 30000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **27.03.2023 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.03.2023** до **17.00** в каб. 320 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (801716) 6 49 33, (8029) 578 35 46.**

УНП 600037767

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

23 марта 2023 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **г. Смолевичи, ул. И. Мележа, 28** | 624850100008000491 | 0,1475 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 28 000 |
| 2 | **г. Смолевичи, ул. В. Быкова, 28** | 624850100008000497 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 28 100 |

**Аукцион состоится 23 марта 2023 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by**, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

ИНФОРМАЦИООНОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ЛОГОЙСКИМ СЕЛЬСКИМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ (организатор аукциона)

**по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Гостиловичи, ул. Гайненская, 1, кадастровый номер 623284601601000375** | 0,1170 | Газификация, электрификация, водоснабжение | 20 000,00 | 2000,00 | 2103,60 + расходы за размещение объявления |
| 2 | **д. Михалово, ул. Дачная, 2А, кадастровый номер 623284603601000112** | 0,1228 | Газификация, электрификация, водоснабжение | 25 000,00 | 2500,00 | 2339,98 + расходы за размещение объявления |
| 3 | **д. Слаговище, ул. Центральная, 10А, кадастровый номер 623284605301000048** | 0,1500 | Водоснабжение | 6 000,00 | 600,00 | 156,80 + расходы за размещение объявления |

Дата, время и место проведения аукциона: **23 марта 2023 г. в 10.00** по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.

Прием документов по 20.03.2023 включительно.

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Минский областной исполнительный комитет: http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/ Логойский районный исполнительный комитет: http://www.logoysk.gov.by/

УНП 600537220

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61) **по поручению районного унитарного предприятия «Любанское ЖКХ»** (продавец, место нахождения: г. Любань, ул. Ленина, 2, тел. (8029) 195-05-55) **проводит открытый аукцион по продаже**

## АДМИНИСТРАТИВНОГО ПОМЕЩЕНИЯ

**с инв. № 643/D-6030, общей площадью 77,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45А-4** ***(право хозяйственного ведения).***

Начальная цена без НДС – **29 300,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **2 930,00** бел. руб.

Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, rlt.by.

Аукцион состоится **24.03.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.03.2023** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: (801794) 68-7-06; (8029) 195-05-55.**

УНП 600208822

Прэм'ера

# СКУЛЬ БЯРУЦЦА ТАКІЯ «ІДЫЁТЫ»,

## альбо Навошта глядзець спектакль паводле Дастаеўскага ў тэатры імя Горкага?

**Пра Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага ведаем: знаўца чалавечых душ. І гэтым для многіх адносіны з яго раманамі абмяжоўваюцца. А як жа тады зразумець (а не засвоіць паводле падручнікаў), што ж такога асаблівага ён ведаў пра людзей? Адказ зразумелы да банальнасці: чытаць. Глыбока, удумліва. Гэта, вядома, самы найлепшы варыянт даведацца думкі пісьменніка. І, быў час, такімі раманамі зачытваліся, іх нават «глыталі», імкнучыся зразумець Карамазавых ці князя Мышкіна, праводзілі ночы з кнігамі Дастаеўскага, каб зразумець яго бачанне свету і культуру, сутнасць якой пісьменнік адлюстраваў. А яго бачанне каштоўнае дагэтуль. Бо ён адзін з тых творцаў, што сфарміравалі рамантычны арэол вакол паняцця «загадкавая руская душа» — і яно пайшло ў свет, дзе яго імкнуцца спасцігнуць не адно стагоддзе. Па сутнасці, архетыпы, якія паказаў пісьменнік, працягваюць існаваць, яны нясуць сваю карціну свету, маюць асаблівае ўяўленне пра каштоўнасці і вартасць чалавечага жыцця.**



Фота БелТА.

Сям'я Дастаеўскіх, нашчадкаў рускага класіка Фёдара Дастаеўскага, з арыгіналам выдання Фёдара Дастаеўскага падчас прыезду ў Беларусь у лютым 2023 года.

Чытаць трэба, але... У наш час нават многія з тых, хто гэтага шчыра хоча, пабачыўшы кнігі з вялікай колькасцю старонак (гэта чытанне ці не больш, чым на тыдзень), пачынаюць шукаць іншыя спосабы пазнаёміцца са зместам. Тут на дапамогу можа прыйсці кіно — балазе, паводле Дастаеўскага знялі шмат фільмаў і нават серыялы (праўда, апошнія таксама патрабуюць часу як мінімум у некалькі вечароў). Тады тэатр у дапамогу — за адзін вечар перад вачыма праходзіць цэлы раман, героі якога матэрыялізуюцца ды існуюць у пэўных абставінах, і глядач сам непасрэдна паглыбляецца ў атмасферу сцэнічнага мікрасвету. Вось гэтаму спрыяе пастаноўка паводле рамана «Ідыёт», якую ажыццявіла Івана Жыган з Сербіі ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага.

У яе Дастаеўскі — як Дастаеўскі. Аповед ідзе па сюжэце, без моднага цяпер рэжысёрскага прачытання. І ніякага асучаснівання — усё як напісана, без кроку ўбок, без аніякай мудрагелістасці, згодна з Дастаеўскім. Зроблены перанос рамана на тэатральную сцэну, што, вядома, не проста, улічваючы аб'ём тэксту. Гэта яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя ажыццявіў сербскі рэжысёр Стэва Жыган, які, відаць, меў піетэт да Дастаеўскага, бо вучыўся ў Санкт-Пецярбургу. Дачка рэжысёра Івана калісьці выконвала адну з галоўных роляў у пастаноўцы, што ішла ў Бялградзе, а цяпер рэалізавала



яе ў Мінску. Сама выступіла рэжысёрам-пастаноўшчыкам спектакля паводле Дастаеўскага, раман якога лічыць вельмі актуальным. Пытання «Навошта?» для яе не існавала з некалькіх прычын. Першая — асабістая: справа бацькі працягваецца ўжо на іншым узроўні. Другая — грамадска-міжнародная: гэта праект у Рэспубліцы Беларусь, дзе Івану Жыган паважаюць, з задавальненнем вітаюць кожны яе прыезд сюды: пад уражаннем ад нашай краіны яна зняла нават дакументальны фільм, наскрозь прасякнуты захапленнем сінявокай зямлёй і людзьмі, якія тут жывуць і гаспадараць. Яна гэта рабіла шчыра, паводле свайго разумення свету і ролі ў ім розных славянскіх народаў. З гэтымі думкамі і працавала над сумесным тэатральным праектам, які ёй даверылі ажыццявіць у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Горкага. Ну і сам Дастаеўскі — гэта трэцяя прычына, якая вынікае з дзвюх першых. Для Іваны як старшыні Таварыства сербска-расійскай дружбы зварот да гэтага пісьменніка цікавы, а яшчэ і сімвалічны — менавіта з-за яго няхай і далёкіх, але роднасных сувязяў з Беларуссю.

Усе тры прычыны сышліся, дазволіўшы ў выніку прадставіць тэатральную версію рамана «Ідыёт», якая доўжыцца, паводле задумы, тры з паловай гадзіны (кніжку за гэты час, вядома, не адолець). Працягласць спектакля зразумелая: раман жа не маленькі. Але інсцэніроўка адштурхоўваецца ад сюжэта з адным нюансам: напачатку нам прадстаўляюць гісторыю Настассі Піліпаўны, якую дзяўчынкай пасля смерці таты ўзяў на выхаванне, але ператварыў ва ўтрыманку заможны памешчык Афанасій Тоцкі.

Пачатак, які насамрэч адкрывае шлях да раскрыцця сутнасці твора пад назвай «Ідыёт», дзе ў цэнтры павінен быць вобраз князя Льва Мікалаевіча Мышкіна.

І раман Дастаеўскага пачынаецца з таго, што ў Расію прыязджае малады чалавек, які доўгі час выхоўваўся і жыў у Швейцарыі, ён вельмі наіўны па натуры (напэўна, не толькі з-за хваробы), але з добрай інтуіцыяй, якая дазваляе яму адчуваць матывы ўчынкаў іншых людзей. Не сапсаваны светам, у якім валадараць жарсці, грошы, інтрыгі. Чалавек з чыстай душой не надта ўпісваецца ў мясцовы асяродак: ну, як ёсць, «ідыёт» — гэта слова як кляймо для таго, хто мысліць і жыве інакш, не як усе навокал. Але самае дзіўнае — ён і не імкнецца «выпраўляцца» — не прыстасоўваецца пад існуючыя норавы, захоўвае сваё сумленне і душу.

Але адчуванне асобы князя Мышкіна ў рамане адбываецца праз вобраз Настассі Піліпаўны. Бо як жа мы зразумеем галоўнага героя без дакладнага ўяўлення пра тое, чаму ён за яе гатовы аддаць душу — шкадуе, кахае ці любіць па-чалавечы? Таму драматургічны пралог, у прынцыпе, слушны для тэатра: гісторыя гэтай жанчыны разгортвалася задоўга да іх сустрэчы з князем, і зразумела пасля, чаму яе крыўда вымушае мітусіцца паміж мужчынамі —Тоцкім, Івалгіным, Рагозіным ды Мышкіным. Няшчасная, зняслаўленая жанчына (якая насамрэч паненка па паходжанні), як можа, чапляецца за жыццё, але адусюль адчувае прыніжэнне. І толькі аднаму князю можа верыць: ён не асуджае... На сцэне мы бачым і адчуваем Настассю Піліпаўну як крохкую жанчыну з параненай душой, безабаронную перад ганьбай, але яна (таму што сама жыве ў брудзе) як ніхто іншы адчувае святло і імкнецца да чысціні, якую бачыць у князі. Такую Настассю Піліпаўну пераканаўча ўвасобіла актрыса Вераніка Пляшкевіч — тонка, на нюансах. Дакладна так, каб было поўнае разуменне прычын яе экзальтаваных паводзін. Яна не наталяецца пачуццёвасцю, а пакутуе ад яе. Пабачыўшы не адну Настассю Піліпаўну на тэатральнай сцэне і ў кіно, няма жадання параўноўваць з імі тую, што бачыш у тэатры імя Горкага, — у яе верыш. Але што больш істотна — шкадуеш разам з князем.

І акцёр Андрэй Сенькін — князь Мышкін, няма сумневу. Сумленны, сарамлівы, далікатны. Ідэал сярод людзей (праўда, складана гэта зразумець тым, хто існуе па іншых правілах). А яшчэ ён любіць людзей — кожнага імкнецца зразумець глыбока. Нібыта прыйшоў з нейкага іншага свету. У адрозненне ад гучнага Рагозіна (артыст Аляксей Качан), які кахае так, што забіць гатовы, князь ціхмяны, здаецца, што нясмелы. І вось так ціха, без навязвання, ён вядзе сваю лінію, пры тым што сам знаходзіцца ў сітуацыі выбару. У супрацьлегласць Настассі Піліпаўне ёсць, напрыклад, Аглая Епанчына (актрыса Вольга Здзярская), задзірлівая і не сапсаваная жыццём. А ён нібыта адчувае і хоча адвесці бяду... Зноў-такі, хто глядзеў серыял, зняты Уладзімірам Борткам, то міжволі будзе згадваць Яўгена Міронава ў гэтай ролі. Але ў такім выпадку трэба быць гатовым да таго, каб запісацца ў кола фанатаў нашага Андрэя Сенькіна — гэта яго роля.

Той выпадак, калі можна ісці ў тэатр «на выканаўцаў». У псіхалагічным тэатры ўсё залежыць ад майстэрства акцёраў, на якое абапіраецца праца рэжысёра. А «Ідыёт» — твор, які заснаваны на псіхалогіі герояў, праз якую Дастаеўскі імкнуўся разважаць пра чалавечыя заганы і магчымасць выйсці з цемры. І вось ён, сам... Толькі не здзіўляйцеся — да традыцыйнай рэжысёрскай падачы матэрыялу ў спектакль уведзены дзіўны ход. Мы ж прыйшлі ў тэатр на Дастаеўскага, ці не так? Сустрэча з ім адбываецца нават літаральна: сам Фёдар Міхайлавіч са сцэны звяртаецца да публікі. Звычайна гледачы ў тэатральнай зале выводзяць мараль гісторыі праз дзеянні герояў. Бываюць спектаклі, дзе ўсё гучыць і гаворыцца прама. А ў нас да таго ж Дастаеўскі, а значыць, што маралі зашмат не бывае — і яе са сцэны даносіць артыст Руслан Чарнецкі, які ўвасобіў аўтара. Цікава, як успрынялі гэты вобраз нашчадкі Дастаеўскага, якія былі запрошаны на прэм'еру ў Мінск?.. Зрэшты, кожны зможа такім чынам мець уласны дыялог з пісьменнікам, у думках адказваючы яму, наколькі і як змяніліся людзі пасля напісання і магчымасці не адно стагоддзе чытаць раман? І ў чым ён можа быць яшчэ актуальны?

Спектакль, які з'явіўся ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Максіма Горкага, заяўлены як «і драма, і камедыя» — такая зачэпка ці «інтрыга» для патэнцыяльных гледачоў. Але калі бачыш персанажаў, якія з'яўляюцца на сцэне ў касцюмах, што ўвасабляюць эпоху Дастаеўскага (над імі папрацавалі мастакі Бажана Ёванавіч і наша Ала Сарокіна), калі бачыш сцэнаграфічнае рашэнне з ухілам у эпоху, але часам яно звяртае да ўмоўнасці (аўтар Барыс Максімавіч, пры ўдзеле Алы Сарокінай), калі ў цёмнай прасторы святлом пазначаны некаторыя героі, то адразу зразумела: гэта драма. А ў чым жа тады камедыя? Князь Мышкін — дзівак? Тое, як ён сябе паводзіць, выклікае смех? (Тут, канешне, можна апеляваць да нашага часу з яго прагматызмам.) Але тады гэта трагедыя. Кожны глядач, што праўда, сам вызначыць, дзе журыцца, а дзе радавацца, калі скончыцца спектакль. Чамусьці няма сумневу, што наша публіка ўсё зразумее правільна.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Агляд часопіса: студзеньскі «Нёман»

# НАДЗЕІ І ЯК ГЭТА БЫЛО...




У студзеньскім нумары «Нёмана» я параіў бы аматарам чытання мастацкай літаратуры пачаць знаёмства з часопісам з рамана Віталя КІРПІЧЭНКІ «Надзея і доля». Пісьменнік нарадзіўся ў Іркуцкай вобласці. Закончыў два вайсковыя авіяцыйныя вучылішчы — у Іркуцку і ў Кіеве. Аўтар некалькіх кніг прозы: «Над ваконцам месяц», «Ваўчынае месца» ... За плячыма — гады вайсковай службы і гады служэння мастацкаму слову. Даўно жыве ў Мінску. В. Кірпічэнка — з кагорты тых празаікаў, што настойліва ствараюць партрэт жыцця ва ўсіх сацыяльных праявах. Увогуле, у нумары — моцны раздзел прозы. Віталя Кірпічэнку дапаўняюць Анатоль БЕНЗЯРУК, журналіст і краязнаўца з Жабінкі, аповесцю «Я цябе бачу» (пра адносіны паміж жанчынай і мужчынам і разам з тым пра наш час; аповесць перакладзена з беларускай мовы); апавяданнямі расійскага і беларускага пісьменніка Алеся КАЖАДУБА, які, хоць і жыве ў Маскве, сваімі тэмамі цесна звязаны з Беларуссю, дзе выдаў на роднай беларускай мове першыя свае празаічныя кнігі; Юрый ПЕЛЮШОНАК («Нататкі чалавека, схільнага да разваг», якія маюць і падзагаловак: «Філасофскія фантазіі»).

З прыкметнымі вершамі ў часопісе выступаюць Віктар КУЦ і Аляксандр СЛАШЧАЎ, абодва жывуць у Гродне. Істотна сярод іншых публікацый вылучаецца падборка вершаў Таццяны ЛЕЙКІ «У шораху белых старонак». Выступленні ў часопісе паэтаў даказваюць, што ёсць яшчэ і сілы ў тых творцаў, хто паэтычным словам расчытвае сігналы вечнага жыцця.

Цікавым падаецца дыялог ганаровага старшыні СП Беларусі, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая ЧАРГІНЦА з палітыкам, якога дужа і прадстаўляць не трэба, светлай памяці Вячаславам КЕБІЧАМ (гутарылі яны, зразумела, некалькі гадоў назад). Запісала тэкст «Як гэта было» Алена БАБОК. Публікацыя нагадала, што ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы заўжды не хапае мемуарыстыкі, гісторыка-публіцыстычных артыкулаў.

У раздзеле «Час. Жыццё. Літаратура» — успаміны пра першыя творчыя крокі вядомага дзіцячага пісьменніка Міколы ЧАРНЯЎСКАГА («Палескі блытанік, альбо Сустрэча па канонах прыгодніцкага жанру»), грунтоўны даследчыцкі артыкул доктара філалагічных навук Івана ЧАРОТЫ «Проза рэальнасці Драгаслава Міхаілавіча». Шкада, што ў нумары «Нёмана» няма рэцэнзій, артыкулаў пра сучасны літаратурны працэс.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# «ДУМЫ МАЕ,

## Дыскусія да 130-годдзя



*«...Думы мае, думкі, кусачыя пчолкі, крылатыя птушкі, лятучыя болкі! Дзе згубілі джала, дзе страцілі крылкі, дзе дажджом зляцелі?*

*Хто пакалечыў вас? Хто, які злоснік скрывіў вас без жалю, на шкоду, у дрэнны бок, на адзін бок?*

*Паўзуць бяскрылыя, памоклыя, змораныя па пустой дарозе ў сівым пыле...*

*Чаму не джыгастыя?*

*Думы мае, думкі, летуценні мае...»*

**Пісьменнік-мысляр, творца, які ўзняў узровень беларускай псіхалагічнай прозы да сусветнага, разважаў пра дзве душы беларуса і родныя карэнні, Максім Гарэцкі, загінуў у досыць маладым веку... Асуджаны на смерць несправядліва, без віны. Але спадчына яго настолькі вялікая, глыбокая, што яшчэ на вякі дасць падставу для роздуму беларусам. Сёння, з нагоды 130-годдзя класіка, мы запрасілі да дыскусіі аб ім на старонках «Звязды» вядомых навукоўцаў. У гаворцы бяруць удзел дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван САВЕРЧАНКА, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі доктар філалагічных навук Яўген ГАРАДНІЦКІ, загадчык аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі доктар філалагічных навук Ганна КІСЛІЦЫНА, прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ доктар філалагічных навук Валерый МАКСІМОВІЧ, архівіст, філолаг Ганна ЗАПАРТЫКА, загадчык кафедры замежнай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат навук, дацэнт Ганна БУТЫРЧЫК.**

### Які твор Максіма Гарэцкага для вас самы значны і чаму?



**І. САВЕРЧАНКА:** На маю думку, ім з'яўляюцца «Скарбы жыцця». У чарнавым варыянце твор меў красамоўную назву «Лебядзіная песня». У замалёўцы «Бачу я поўную хату людзей...» Гарэцкі сфармуляваў ідэю бясконцасці жыцця. Пісьменнік прытрымліваўся глыбока народнага стаўлення да смерці, якую належыць сустракаць без адчаю як праяву натуральнага колазвароту часу і падзей. Навела «Гарматы грукаюць...» адлюстроўвае неўпарадкаванасць зямнога жыцця, вайсковае сутыкненне народаў, што паслужыла прычынай бясконцых людскіх трагедый. Запаветную надзею Гарэцкага на сапраўднае адраджэнне беларускага народа, яго выйсце ў шырокі свет утрымлівае замалёўка «Радзіўся я ў балоце...» У мікранавеле «Светач жыцця майго...» пісьменнік выказаў нясцерпны боль і невымоўную крыўду з-за таго, што быў пазбаўлены магчымасці вольна тварыць, належным чынам бараніць матчыну мову і родную зямлю: «Светач жыцця майго гарэў цьмяна. Ваканіцы волі мае былі зачынены глуха... Пасохлую ніву маю тапталі, драталі, з гора майго кпілі. Была нязносная мне крыўда... Скарбы мае, скарбы бясцэнныя! Што з вамі робіць! Як жа мне жыць...»



**Г. ЗАПАРТЫКА:** «Камароўская хроніка». Прыклад сакралізацыі памяці пра свой род, сям'ю, эпоху і яе «малых» герояў, незаўважных і непрыкметных для «вялікай» гісторыі і навукі аб ёй. Цэнтрам яго сусвету была Малая Багацькаўка — мілая родная вёсачка на Магілёўшчыне. Гэта не проста літаратурны твор, жанр якога канчаткова вызначаны як аповесць, — гэта крыніца, ці нават збор крыніц, па сацыяльнай гісторыі грамадства за паўтара стагоддзя. Да таго ж і аўтабіяграфічная крыніца. Алесь Адамовіч называў гэты твор эпапеяй-дзённікам.



**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Для мяне найбольш адметны твор Максіма Гарэцкага — гэта «Лявоніус Задумекус». Гэты твор, які аўтар пісаў у надзвычай складаных жыццёвых абставінах, пакуль што не ацэнены пасапраўднаму. Звычайна звяртаюць увагу на яго незавершанасць. Аўтар папросту не меў магчымасці «перабяліць» чарнавік. І ўсё ж самая форма аповеду ў гэтым творы, яго нелінейнасць, фрагментарнасць, свабодная спалучанасць асобных сцэн, ураджанняў і медытацый, паказвае на свядомае выкарыстанне менавіта такога спосабу структурнай арганізацыі. Аповед вядзецца героем пераважна ў будучым часе, толькі зрэдку ў асобных мясцінах перамяжоўваючыся звыклым для празаічнага дыскурсу мінулым часам. Гэта зрушвае і міфалагізуе малюнак рэальнасці, надае ёй містэрыяльную значнасць.



**В. МАКСІМОВІЧ:** У творах Гарэцкага моцна выяўлены канфлікт, светапоглядныя супрацьстаянне, высокі накал драматызавання пачуцця. Чалавек змушаны рабіць свой выбар. І «На імперыялістычнай вайне» — самы, як на мой погляд, пакаральны твор. Ды драматызм яго — толькі як сюжэтаствааральная аснова. Ідэя ж твора — у пропаведзі ідэі мірнай, чалавекалюбнай, у закліку спыніць назаўсёды цывілізацыйныя калатнечы, войны, канфлікты і ўсім разам займацца стваральнай працай.



**Г. КІСЛІЦЫНА:** Прасцей сказаць, які твор самы любімы, самы перачытваны. Гэта, безумоўна, «Скарбы жыцця». Я добра помню, як мяне накрыла эмоцыямі пасля першага прачытання. Мяркуецца, што празаік пісаў яго ў 1932—1935, 1937 гадах, таму зразумела, што весялосці ад яго чакаць не даводзіцца. Але не прыналежным беларускім аўтарам горкая іронія, сарказм, спецыфічны чорны гумар пры апісанні шакавальнай рэчаіснасці, дзе праявіць баль гвалт і несправядлівасць, — робяць гэты твор абсалютна адметным па інтанацыі. Вусцішнасць «Скарбаў жыцця» цалкам катарсічная! Прызнаюся, што я б ніколі не разгадала самастойна ўсе сімвалы і алегорыі, зашыфраваныя ў гэтым творы, таму яшчэ раз хочацца падзякаваць літаратуразнаўцам, якія парупіліся над яго публікацыяй і тлумачэннем.



**Г. БУТЫРЧЫК:** Не думаю, што буду надта арыгінальнай, калі пачну з аповесці «Дзве душы». Праз гэты твор арганічна праратае значная частка праблематыкі ўсёй беларускай літаратуры, у прыватнасці, трагічная гісторыя беларуса-мысляра, беларуса-думанніка, які дбае пра духоўнае адраджэнне Бацькаўшчыны. Невыпадкова Ігнат Канчэўскі — аўтар знакамітай кнігі «Адвечным шляхам. Даследзіны беларускага светагляду» — імя галоўнага героя, Ігнат Абдзіраловіч, узяў сабе за псеўданім. Не магу не згадаць выспу Патмос, у якой Максім Гарэцкі бачыў ратунак і збавенне, крыніцу душэўнай раўнавагі і прытулак для выгнанніка. Выспай Патмос пісьменнікназваў творчую працу, вынікі якой падведзены ў філасофска-алегарычных і ў значнай меры спавядальных «Скарбах жыцця».

### Што ў асобе Максіма Гарэцкага самае адметнае, што магло б паслужыць падставай для міфатворчасці?

**І. САВЕРЧАНКА:** Ён з'яўляецца ўзорам самаадданага служэння Беларусі, сімвалам ахвярнай і бескарыслівай працы. Варта прасачыць станаўленне творчай асобы Максіма Гарэцкага, узнавіць яго светабачанне на розных этапах жыцця, рэканструяваць уздзеянне на яго творчасць нацыянальнай міфалогіі і традыцыйнай беларускай культуры.

**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Паўставанню феномена Максіма Гарэцкага спрыялі, на маю думку, дзве акалічнасці: рана абуджанае і няўхільнае нацыянальнае ўсведамленне, якое вяло да самаадданага служэння ідэі духоўнага адраджэння народа, і неспатольная прага мастацкага самавыяўлення. Не можа не здзіўляць і не захапляць ягонае мужнае трыванне, адданасць роднаму стваральнаму слову ў любых, нават найгоршых жыццёвых абставінах!

**Г. ЗАПАРТЫКА:** Радкі ўспамінаў Андрэя Сухога: «Ласкавасць, чуласць, пранікнёнасць гарнулі да яго людзей. Ён меў вялікі дар чалавечнасці, крышталькай людской дабраты», — а таксама Веры Маслоўскай: «Любіў Максім Гарэцкі жартаваць, смяяцца. Вельмі ахвочы быў да песень і не раз спяваў з курсантамі». Быў вельмі сціплы. Усё гэта і ёсць адметным у асобе Максіма Гарэцкага, але ці можа яно служыць падставай для міфатворчасці? А вось яго шляхі-дарогі — многае да канца не даследавана. Варта запісаць па гэты рахунак месяцы яго лячэнне пасля ранення ў віленскім шпіталі, дзе «працавала міласэрнаю сястрою і клала пад падушкі «Нашу Ніву» нябожчыка Цётка», яго фізічныя пакуты і жыццё, каб лячыцца, у Маскве, Магілёве, Жалезнаводску, «прыпынкі» ваеннаабавязанага: Пскоў, Старая Руса, Гомель, Жлобін, Асіповічы, «пешшу з Урэчча да Слуцка», — пасля Паўлаўскае вучылішча і накіраванне ў 1916 годзе ў Іркуцк, куды захоча адведацца ў 1926 годзе. І гэта толькі частка «таямніц» Максіма Гарэцкага.

**В. МАКСІМОВІЧ:** Само слова «міфатворчасць» у дадзеным кантэксце, як думаецца, мае не вельмі станоўчую канатацыю. Сэнс яго неяк міжволі звязваецца са значэннем выдуманасці, змістыфікаванасці, падманнасці. Накшталт, давайце сканструюем нейкую кідкую фішку, абставім яе як след рознымі доказамі, дадзім ёй пэўную назву і пусцім у вялікі свет. Галоўнае — каб было праўдападобна. У выпадку з Гарэцкім нічога выдумваць, падтасоўваць не трэба. Гэта вялікі чалавекалюб і праўдалюб, знаўца чалавечай душы, міратворац, які стаіць на варце чалавечай духоўнасці, чысціні, маральнасці.

**Г. КІСЛІЦЫНА:** Я часта паўтараю, што не можа быць нічога цікавейшага за праўду. Бо лёс Гарэцкага, лёс яго сваякоў, іх узаемадносіны — гэта суцэльны раман. Напрыклад, шмат хто ведае гісторыю трагічнай смерці яго сястры Ганны, але мала хто ведае, напрыклад, што пасля яе смерці скончыў жыццё самагубствам яе каханы. Больш за тое, па яго смерці сябры выдалі невялікую кнігу, прысвечаную яе каханаму (ведаю, што адзін асобнік захоўваецца ў Пецярбургскай публічнай бібліятэцы). Нямногія чыталі перапіску Максіма Гарэцкага з жонкай, а, між тым, гісторыя іх кахання магла б стаць асновай для любоўнага рамана. Ну і факт таго, што з успамінаў Галіны Максімаўны Гарэцкай нарадзілася «Блакадная кніга» Алеся Адамовіча і Данііла Граніна, мне здаецца феменальным, бо ёсць сведчанням таго, што ад сапраўднага таленту загараецца новы талент, хоць шляхі такой творчай пераемнасці не адразу відавочныя.

**Г. БУТЫРЧЫК:** На мой погляд, міфалагічным локусам, месцам з'яўляецца востраў Патмос — месца творчасці і сама творчасць — востраў, на якім збіраюцца alter ego пісьменніка, як на ўзроўні псеўданімаў, якія ён у розныя часы выкарыстоўваў (Максім Беларус, М. Б. Беларус, М. Г., А. Мсціслаўскі, Дзед Кузьма, Мацей Мышка, Мізэрыус Монус), так і на ўзроўні герояў-думаннікаў (Ігнат Абдзіраловіч, Лявоніус Задумекус).

### Аналізуючы беларускі менталітэт, Максім Гарэцкі звяртаўся да сакральна-містычнага... Наколькі актуальны сёння яго падыход?

**І. САВЕРЧАНКА:** Феномен беларусаў як асобнай еўрапейскай нацыі з глыбокай гісторыяй і вялікай культурай дагэтуль як след не раскрыты. Сто гадоў назад Максім Гарэцкі і іншыя беларускія адраджэнцы першымі паспрабавалі разгадаць таямніцу беларусаў, выявіць асаблівасці менталітэту нацыі, паказаць яе духоўны патэнцыял. На пачатку творчага шляху Гарэцкі звярнуўся да мастацкага асэнсавання фантастычных і загадкавых з'яў. Адно з яго ранніх апавяданняў мела красамоўную назву — «Патаёмнае» (1913). Твор пачынаецца сцэнай вяселля, якое пастунова трансфармуецца ў дзіўную містэрыю. Пісьменнік даводзіў, што жыццём кіруе таямнічая сіла, а паміж рэальным і нерэальным светам не існуе трывалай мяжы. Філасофія пантэізму, жывой прыроды яскрава выявілася ў апавяданні «Цёмны лес» (1913). Прырода на старонках апавядання адухаўляецца: глухая пушча — «ракоча»; лісцейкі на бярозах — «гамоняць»; вецер — «злуецца». Такім чынам, Гарэцкі феномен беларусаў вытлумачыў асаблівымі адносінамі людзей з прыродай і навакольным асяроддзем.

**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Адна з асноўных тэм Максіма Гарэцкага — рэфлексія беларускага інтэлігента, выхадца з гушчы народнай, адносна свайго месца ў гістарычным працэсе фармавання нацыі, ягоныя адчуванні пэўнай раздвоенасці паміж адданасцю «родным карэнням» і вызначаным прызначаннай яму місіі. Герой Гарэцкага не заўсёды можа прыняць народныя погляды і ўяўленні, пазначаныя прымхамі і страхамі. Аднак ён бачыць у гэтым таксама і адметную паэзію, свядчанне духоўнага жыцця народа, пошукаў адказу на таямніцы і загадкі быцця. Таямнічае, загадкавае, містычнае, па вялікім рахунку, звязвае героя-інтэлігента і героя «з народу», паказвае на іх генетычную блізкасць.

**Г. БУТЫРЧЫК:** Сакральна-містычнае — важны складнік нацыянальнай ментальнасці, нацыянальнага вобраза свету; цікавасць да фальклору, да народнай міфалогіі будзе заставацца нязменнай праз стагоддзі, гэта — «роднае карэнне». Мы бачым, як «патаёмнае» Максіма Гарэцкага прарастае ў творах Уладзіміра Караткевіча, напрыклад. Сакральна-містычнае фарміруе сістэму каштоўнасцяў народа. Сакралізацыя гісторыі, сакралізацыя Бацькаўшчыны.

**Г. ЗАПАРТЫКА:** Максім Гарэцкі жыў сярод носьбітаў нацыянальнага сакральна-містычнага: народных вераванняў, песень і легенд. Яго брат згадваў: «Часта расказваў ён нам, меншым, казкі, страшныя апавяданні, пераважна выдуманыя самім». А пасля былі захапляльныя эпізоды ў яго творах, дзе апавядалася пра сны, дзівосных музыкаў, здані. Наколькі актуальны сёння яго падыход? Я б сказала: магчымы. Жанр фэнтэзі набыў папулярнасць і не страчвае сваей пазіцыі. Думаю, што ў беларускай міфалогіі больш чым дастаткова для яго сюжэтаў.

# ДУМКІ, ЛЕТУЦЕННІ МАЕ...»

## Максіма Гарэцкага

**В. МАКСІМОВІЧ:** Гарэцкі не проста так звяртаўся да сакральна-містычнага. Гэта быў своеасаблівы прыём, які даваў яму магчымасць бліжэй падступіцца да разгадкі нацыянальнага менталітэту, акрэсліць адметнасці беларускага духу, рысы характару беларуса. Ці ж гэта дрэнна? А чаму не актуальна сёння? Мы заўсёды праяўляем увагу да чагосьці загадкавага, інтрыгоўнага, казачнага, містычнага, імкнёмся знайсці яго разгадку. Такім чынам мы разгадваем (ці робім спробу разгадаць) і саміх сябе. Сённяшняя лацінаамерыканская літаратура таксама адметная сваім зваротам да міфа, што зрабіла ёй сусветную славу (згадаем таго ж Борхеса). У асобных творах Гарэцкага фантазійны элемент набывае адзнаку стылю, пісьменніцкай канцэпцыі, звязанай з пэўным філасофскім падтэкстам. За прыгодніцкімі або дэтэктыўнымі гісторыямі таксама стаіць свая філасофія. Ці не праўда?

**Г. КІСЛІЦЫНА:** Усё ж як навуковец я стаю на матэрыялістычных пазіцыях і бачу ў гэтай цікаўнасці да містыкі перш за ўсё праяву часу з яго модай на пострамантызм, сімвалізм, экспрэсіянізм.

**Г. КІСЛІЦЫНА:** Ён рэальна быў пачынальнікам, а быць першым — гэта і адказнасць, і цяжар. Табе няма на каго спаслацца, няма з кім дыскутаваць, няма каго аспрэчваць. Ты як Бог, які стварае Зямлю, павінен паклапаціцца пра ўсіх, не маючы ўзору перад вачыма. Я бясконца цаню тое, што ён зрабіў, і зрабіў якасна, застаючыся пры гэтым выдатным стылістам!

**Г. БУТЫРЧЫК:** Варта адзначыць і дзейнасць Максіма Гарэцкага як фалькларыста, які ад сваёй маці Ефрасінні Міхайлаўны запісаў песні і выдаў іх асобнай кніжкай «Народныя песні з мелодыямі» разам з Ягоравым. Народнай паэзіі, дарэчы, прысвечаны матэрыял у «Гісторыі беларускай літаратуры». Дасканалае веданне беларускага фальклору адчуваецца і ў апавяданнях пісьменніка, дзе «патаёмнае» — частка мастацкага ўніверсуму творцы. Перакладчыцкая дзейнасць таксама можа разглядацца як навуковая, асабліва калі размова ідзе пра пераклад «Слова аб палку Ігаравым», якое ў беларусаў з'явілася практычна адначасова ў двух перакладах — Гарэцкага і Купалы.




## Як вы расцэньваеце дзейнасць Максіма Гарэцкага як навукоўца?

**І. САВЕРЧАНКА:** Яго пяру належыць унікальная «Гісторыя беларускай літаратуры», а таксама шэраг артыкулаў па гісторыі і тэорыі літаратуры. Гарэцкі ўсебакова асэнсаваў літаратурны працэс на беларускіх землях ад XI да XX стагоддзя. Ён сістэматызаваў багатую пісьмовую спадчыну паводле жанраў, родаў і літаратурных стыляў, вызначыў асноўныя мастацка-эстэтычныя здабыткі, прапанаваў уласную перыядызацыю літаратуры і акрэсліў уклад асобных творцаў у развіццё беларускага мастацкага слова.

**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Найперш, канешне, згадваюцца яго літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя працы. У гэтым Гарэцкі працягваў традыцыю, закладзеную Максімам Багдановічам. Але не забудзем таксама, што Гарэцкі зрабіў немалы ўнёсак і як лінгвіст, і як фалькларыст, збіральнік народных духоўных скарбаў. Разумеючы, як шмат чаго не стае для развіцця маладой нацыянальнай культуры, ён працаваў на розных дзялянках. Разважаў пра значэнне тэатральнага мастацтва і сам ствараў наватарскія п'есы («Антон», «Жартаўлівы Пісарэвіч»).

**Г. ЗАПАРТЫКА:** Максім Гарэцкі быў выдатным педагогам, літаратуразнаўцам, фалькларыстам, мовазнаўцам. Яго літаратуразнаўчыя працы ўпершыню стварылі нацыянальную літаратурную панараму. На яго «Гісторыі» выхоўвалася новае пакаленне настаўнікаў, школьныя праграмы напаўняліся імёнамі і творамі нацыянальнай літаратуры. У 1920-я гады ён быў адным з тых літаратуразнаўцаў і крытыкаў, якія з увагай ставіліся да маладога літаратурнага пакалення.

**В. МАКСІМОВІЧ:** Першая канцэптуальная «Гісторыя беларускай літаратуры» доўгі час была адзіным падручнікам для школ і ВНУ. Ён склаў «Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век — 1905 год», склаў і выдаў «Руска-беларускі слоўнік» (разам з братам), «Маскоўска-беларускі слоўнічак», іншыя лексікаграфічныя працы. Яшчэ было зроблена шмат фальклорных запісаў, выдадзена зборнікаў, дадзена аб'ектыўная ацэнка тагачаснаму літаратурнаму працэсу. Аб аўтарытэце Гарэцкага-навукоўца сведчыць і той факт, што навукоўцы пазнейшых часоў бессаромна прысвойвалі сабе яго першаадкрыцці, канцэптуальныя высновы, карыстаючыся спецфондамі. І ніхто не спасылаўся на першакрыніцы, бо Гарэцкі быў рэпрэсіраваны, а пазней і расстраляны.

## Як бы вы апісалі прынцыпы філасофіі Максіма Гарэцкага?

**І. САВЕРЧАНКА:** Максім Гарэцкі — унікальны пісьменнік-інтэлектуал, сапраўдны нацыянальны мысліцель. Ён з'яўляецца аўтарам геніяльнай аповесці «Дзве душы» (1918—1919), у якой выдатна ўвасобілася сацыяльная філасофія пісьменніка. Ён выступае за адраджэнне Беларусі, за сацыяльную справядлівасць, абараняе правы працоўных, патрабуе развіцця нацыянальнай адукацыі і культуры. Смела асуджае паноў-рэнегатаў, якія не падтрымлівалі палітычнай самастойнасці Беларусі. Гарэцкі зусім не схільны ідэалізаваць працоўны люд і мужыкоў. У аповесці менавіта сяляне забіваюць жонку пана Абдзіраловіча, пакінуўшы немаўля сіратой. Сяляне спалілі сядзібу Абдзіраловічаў, а сялянскі хлопчык Таўкач, у рукі якога трапіў альбом панскай сям'і, па-дзікунску распраўляецца з фотаздымкамі. У адрозненне ад павяхоўных прапагандыстаў-агітатараў, Гарэцкі якраз указваў на тое, што ў віхуры падзей для чалавека няма нічога пэўнага, зразумелага і яснага, усё надзвычай хістка і пераменліва, цьмяна і непрадказальна. Пры гэтым на старонках аповесці Гарэцкі аб'ектыўна паказваў, што пераход беларускай інтэлігенцыі на бок бальшавікоў — гэта лагічны вынік іх жыццёвага досведу, плён глыбокіх унутраных пошукаў.

**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Асноўныя праблемы, якія закранаюцца ў яго творах, гэта суадносіны калектыўнай і індывідуальнай свядомасці, нацыянальная ідэнтычнасць і менталітэт, чалавек і гісторыя, чалавек у экстрэмальных умовах, чалавек у пошуку духоўнай апоры.

**Г. ЗАПАРТЫКА:** Ужо ў самых першых літаратурных спробах гучыць: «Я не хачу трываць! Я не вытрываю. Бо нельга вытрываць. Я скіну, сарву ланцугі свайго старога жыцця і зраблю жыццё новае. Зраблю!» Ён быў шчырым ва ўсім — любіў радзіму да самазабыцця, любіў сям'ю, любіў сваю Багацькаўку і раптам: «Багацькаўка! Мая мілая і ўмесце тым пастылая Багацькаўка! Люблю я цябе з тваім садком, ляском... Люблю тваіх мілых, слаўных, вясёлых дзетак, тужлівых старычкоў і вясёлых пявунняў-дзевак. Ненавіджу тваю гразь, непрытульнасць. Скарэй нада набрацца сілухны і пачаць варушыць камяні»... — гэта з прадмоўкі-прысвячэння да «Хрэстаматыі беларускай літаратуры». А таму, што не ўмеў хлусіць, у тым ліку і сабе самому. «Думаць сэрцам» было яго галоўным прынцыпам.

**В. МАКСІМОВІЧ:** З творчасцю Гарэцкага звязана найперш устаноўка на экзістэнцыялізацыю духоўнага свету героя нацыянальнай літаратуры. Яна праявіла сябе ў пакутлівых роздумах героя Гарэцкага — самарэфлексаванага, удумлівага, з вострай рэакцыяй. Трагізм рэальнасці — у немагчымасці дасягнення героем паўнавартаснай рэалізацыі, ён адчувае горыч адрынутасці, асуджанасці на адзіноту. Канфлікт героя ўспрымаецца перадусім як канфлікт яго з самім сабой. Асаблівае месца ў творчай спадчыне пісьменніка займаюць дакументальна-мастацкія запіскі «На імперыялістычнай вайне». Ён паспрабаваў выявіць надзвычай складаны комплекс пачуццяў чалавека на вайне, дзе ў супярэчлівым адзінстве перапляліся свядомае і падсвядомае, рацыянальнае і ірацыянальнае, нізкае і высокае, гуманнае і антыгуманнае. Пісьменнік задаецца пытаннем пра асабістую адказнасць чалавека за здзейсненае. Згодна з яго мастацкай канцэпцыяй, не можа быць ніякага апраўдання віны, зробленаму выбару, асабліва калі гэта датычыцца лёсу іншага.

**Г. КІСЛІЦЫНА:** Разглядаць яго творчасць у рэчышчы філасофіі экзістэнцыялізму, безумоўна, слушна. Але я, напэўна, назвала больш шырокае паняцце — антрапацэнтрызм. З аднаго боку, Гарэцкі ставіць патрэбы чалавека мярылам усяго, што адбываецца, з другога — гэты самы чалавек часта ў яго творах супадае з самім аўтарам. Чалавек у Гарэцкага — не ўладар сусвету, але і сусвет, які не ўлічвае яго пачуццяў, страхаў, жаданняў, мараў, ігнаруе прыватнае, — антыгуманны і чужы. Гэтае пачуццё безабароннасці чалавека перад тварам гістарычных падзей — асноўны нерв яго творчасці.

**Г. БУТЫРЧЫК:** Відавочна, што паводле сутнасці сваёй яго філасофія экзістэнцыяльная, бо ставіць пытанні чалавечага існавання: што такое жыццё і смерць? у чым сэнс чалавечага існавання? што ёсць чалавек? які чалавек бачыць сваю будучыню? як пераадолець страх? і г. д. Адметнасць у тым, што, гаворачы ад імя сваіх герояў (а большасць твораў пісьменніка — аўтабіяграфічная), пісьменнік думае за Беларусь. Яго экзістэнцыялізм, так бы мовіць, нацыяцэнтрычны, беларусацэнтрычны. Невыпадкова адзін з першых псеўданімаў Максіма Гарэцкага — Максім Беларус. Два важных філасофскія пытанні сфармуляваны назвамі твораў «Што яно?» і «За што?» (пазней «Ціхая плынь»). Мне падаецца, што ў гэтых два пытанні змяшчаецца творчасць, ды і жыццё Максіма Гарэцкага.

## Адпаведна яго значнасці ці вядомы і пазнавальны Гарэцкі сёння і што зрабіць для папулярызацыі яго творчасці?

**І. САВЕРЧАНКА:** Аб значнасці твораў класіка нацыянальнай літаратуры, іх мастацкіх і эстэтычных вартасцях несумненна неабходна даходліва расказваць школьнікам на ўроках літаратуры, а таксама знаёміць студэнтаў філалагічных і іншых факультэтаў у адпаведных курсах і лекцыях.

**Я. ГАРАДНІЦКІ:** Нельга сказаць, што Максіму Гарэцкаму як класіку нацыянальнай літаратуры не ўдзяляецца годнай увагі. Але не магу і сцвярджаць, што створанае гэтым вялікім майстрам знайшло ўрэшце адэкватнае і канчатковае асэнсаванне. Значным крокам была б экранізацыя некаторых яго твораў. Давайце памарым і ўявім фільм, зняты паводле таго ж «Лявоніуса Задумекуса» ў авангардным стылі. Але для гэтага наш кінематограф меў бы выпрацаваць адпаведную мастацкую мову.

**Г. ЗАПАРТЫКА:** І вядомы, і пазнавальны. Школьная моладзь вывучае яго творы, у тэатрах ставяцца спектаклі, ствараюцца фільмы. Але гэта толькі драбніцы. Мы не маем вартага нацыянальнага фільма пра падзеі Першай сусветнай вайны. Але ж мы маем творы Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне», «На этапе» і іншыя — поўныя драматызму той эпохі. А ўвасабленне тэмы не менш таленавітае, чым «На Заходнім фронце нічога новага» Э.- М. Рэмарка. А па творы апошняга колькі ўжо было экранізацый? А «Віленскія камунары»? Юрка Гаўрук успамінаў: «Максім Іванавіч пачаў расказваць мне пра новы свой твор «Віленскія камунары»... Ён спытаў у мяне: «Як вы думаеце, ці мне лепш пісаць раман, ці рабіць сцэнарый?» Яго надзвычайна цягнула яшчэ да кіно». Вось так. Можа прыйшоў час звярнуць увагу кінематаграфістаў на мастацкія творы Максіма Гарэцкага? Ды і сама постаць яго, драматычныя калізіі яго жыцця варты сцэнарыя і экранізацыі.

**В. МАКСІМОВІЧ:** Даўно прыспеў час выдаць поўны збор твораў Максіма Гарэцкага. Гэта сапраўды была б знакавая падзея. Праходзяць штогод Гарэцкія чытанні. Была раней прапанова распрацаваць турыстычныя маршруты па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка з наведваннем Літаратурнага музея на яго радзіме, але, падаецца, яна так і засталася нерэалізаванай. Варта было б праводзіць літаратурныя конкурсы сярод празаікаў пад знакам ушанавання постаці гэтага слаўнага сына Беларусі.

**Г. КІСЛІЦЫНА:** Цалкам не супадаюць значнасць зробленага Максімам Гарэцкім, маштаб яго асобы, вядомыя на сёння акалічнасці яго лёсу з тым, як яго творчасць прадстаўленая ў СМІ, у падручніках, у кінематографе і тэатры. Што зрабіць? Прадставіць належным чынам, не да юбілейных датаў, а для сучаснікаў і нашчадкаў, бо яго жыццё і дзейнасць з'яўляюцца фенаменальнай з'явай беларускай культуры.

**Г. БУТЫРЧЫК:** Мне падаецца, што, нягледзячы на тытанічную працу беларускага літаратуразнаўства, беларусы недаравальна мала ведаюць пра Максіма Беларуса, Лявоніуса Задумекуса, Максіма Гарэцкага. Знаёмства ў лепшым выпадку абмяжоўваецца школьнай праграмай. Сталае кола чытачоў класічнай беларускай літаратуры, на жаль, па-ранейшаму застаецца невялікім. Хочацца верыць, што юбілейныя мерапрыемствы, у тым ліку і наша дыскусія, абудзяць цікавасць да творчасці пісьменніка і жаданне адкрыць для сябе новыя творы аўтара апавяданняў «Роднае карэнне» і «Літоўскі хутарок», запісак «На імперыялістычнай вайне», аповесці «Дзве душы».

**Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**:
**ООО «ИПМ-Консалт оценка»,**
г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703

**Продавец: ОАО завод «ВИЗАС»,**
210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | | **Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 80 %)** | | |
| 1 | 1125 | Станок центрошлифовальный SIXb160x1 | 2784,00 | 139,20 |
| 2 | 1131 | Станок вертикально-сверлильный 2А125 | 792,00 | 39,60 |
| 3 | 1340 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-2 | 1368,00 | 68,40 |
| 4 | 1430 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-4 | 2760,00 | 138,00 |
| 5 | 2031 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 6 | 2033 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 7 | 2310 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 840,00 | 42,00 |
| 8 | 511 | Ножницы комбинированные Н-514 | 1272,00 | 63,60 |
| 9 | 823 | Ножницы комбинированные Н-514 | 1272,00 | 63,60 |
| 10 | 2843 | Пресс-ножницы НВ1429 | 1272,00 | 63,60 |
| 11 | 1989 | Станок фуговальный СФА-4 | 1152,00 | 57,60 |
| 12 | 239 | Станок строгальный по дереву 350 мм | 504,00 | 25,20 |
| 13 | 2900 | Станок торцешлифовальный | 144,00 | 7,20 |
| 14 | 2914 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-356 | 696,00 | 34,80 |
| 15 | 2922 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-356 | 696,00 | 34,80 |
| 16 | 2923 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-368 | 696,00 | 34,80 |
| 17 | 444 | Станок вертикально-сверлильный 2А135 | 912,00 | 45,60 |
| 18 | 51 | Станок рейсмусовый деревообрабатывающий | 840,00 | 42,00 |
| 19 | 3798 | Станок пильно-брускующий ВЗ-369 | 4296,00 | 214,80 |
| 20 | 3692 | Система вентиляции | 4944,00 | 247,20 |
| 21 | 1059 | Машина бумагорезальная ЗБР-70 | 1008,00 | 50,40 |
| 22 | 104 | Станок шпонко-фрезерный HURT | 1344,00 | 67,20 |
| 23 | 1626 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г | 1464,00 | 73,20 |
| 24 | 2315 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р80Г | 1752,00 | 87,60 |
| 25 | 625 | Станок шпонко-фрезерный 692А | 1776,00 | 88,80 |
| 26 | 1224 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 1776,00 | 88,80 |
| 27 | 1178 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 1776,00 | 88,80 |
| 28 | 1562 | Колодец охлаждения корзины | 206,40 | 10,32 |
| 29 | 1379 | Электропечь У60А | 1128,00 | 56,40 |
| 30 | 2036 | Станок универсально-заточной 3М642Е | 6360,00 | 318,00 |
| 31 | 2538 | Станок универсально-заточной 3Е642Е-01 | 6360,00 | 318,00 |
| 32 | 2887 | Станок специально-заточной ВЗ-318 | 5664,00 | 283,20 |
| 33 | 2925 | Станок заточной ВЗ-318Е | 7080,00 | 354,00 |
| 34 | 3008 | Станок универсально-заточной 3Е642Е | 6360,00 | 318,00 |
| | | **Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 50 %)** | | |
| 35 | 1787 | Кран консольный к/к 0,25 т | 960,00 | 48,00 |
| 36 | 1853 | Кран консольный к/к 1,00 т | 2700,00 | 135,00 |
| 37 | 1880 | Монорельс с электроталью груз. 0,5 т | 720,00 | 36,00 |
| 38 | 2056 | Монорельс м/р 0,5 т | 780,00 | 39,00 |
| 39 | 2182 | Кран-балка к/б 1 т | 1080,00 | 54,00 |
| 40 | 2712 | Монорельс 0,25 т | 84,00 | 4,20 |
| 41 | 2775 | Кран консольный к/к 0,50 т | 900,00 | 45,00 |
| 42 | 5080 | Станок заточной С/И 10МА-411 | 294,00 | 14,70 |
| 43 | 644 | Установка аккумуляторная для зарядки эл-кары | 186,00 | 9,30 |
| 44 | 106 | ЛИТФОРМА 1835-4029 ТИП 20 | 3 420,00 | 171,00 |
| 45 | 1127 | Станок универсально-заточной GALP | 3 060,00 | 153,00 |
| 46 | 1167 | Станок токарно-револьверный 1341 | 1 560,00 | 78,00 |
| 47 | 1170 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1 440,00 | 72,00 |
| 48 | 1216 | Станок токарно-револьверный 1Н1341 | 1 020,00 | 51,00 |
| 49 | 123 | Станок токарно-затыловочный МИЧИГАН | 3 480,00 | 174,00 |
| 50 | 1318 | Кран консольный к/к 0,25т | 426,00 | 21,30 |
| 51 | 1382 | Станок универсально-заточной GAP | 8 220,00 | 411,00 |
| 52 | 1417 | Наждачное точило | 174,00 | 8,70 |
| 53 | 1625 | Консольный кран 0,40т | 2 340,00 | 117,00 |
| 54 | 2035 | Станок токарно-револьверный 1Г325 | 960,00 | 48,00 |
| 55 | 2079 | Станок широкоуниверсальный фрезерный 675М | 840,00 | 42,00 |
| 56 | 2121 | Станок электроимпульсный 4Б724 | 1 080,00 | 54,00 |
| 57 | 2159 | Станок токарно-затыловочный DH250 | 13 800,00 | 690,00 |
| 58 | 2425 | Станок электроэрозионный 4532-ФЗ | 5 040,00 | 252,00 |
| 59 | 2491 | Монорельс 0,25т | 150,00 | 7,50 |
| 60 | 2555 | Галтовочный барабан 10МА | 3 960,00 | 198,00 |
| 61 | 2785 | Галтовочный барабан 41114-1 | 1 020,00 | 51,00 |
| 62 | 2829 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 2 520,00 | 126,00 |
| 63 | 2892 | Швейная машина ПШМ КЛ.550 | 204,00 | 10,20 |
| 64 | 2895 | Швейная машина ПШМ КЛ.1022М | 204,00 | 10,20 |
| 65 | 2897 | Электронная раскройная машина ЭЗМ4-160 | 138,00 | 6,90 |
| 66 | 2927 | Полуавтомат специально-заточной для дисков пил ВЗ-330 | 21 180,00 | 1 059,00 |
| 67 | 2978 | Моечная машина мод. 030696 | 1 680,00 | 84,00 |
| 68 | 332 | Точильно-шлифовальный станок модель ВЗ-879-02 | 576,00 | 28,80 |
| 69 | 3676 | Система прецизионной лазерной маркировки | 73 800,00 | 3 690,00 |
| 70 | 3698 | Модернизация вальцев резинообр. ЛБ-200 100/100 | 36 780,00 | 1 839,00 |
| 71 | 5076 | Станок для обечаек 10МА-264 | 2 160,00 | 108,00 |
| 72 | 318 | Оптическая делительная головка ОДГ-10 | 660,00 | 33,00 |
| 73 | 3009 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 33 540,00 | 1 677,00 |
| 74 | 3010 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 33 540,00 | 1 677,00 |
| 75 | 3011 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 34 620,00 | 1 731,00 |
| 76 | 3012 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 34 620,00 | 1 731,00 |
| 77 | 3013 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 34 620,00 | 1 731,00 |
| 78 | 3014 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 34 620,00 | 1 731,00 |
| 79 | 3015 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 34 620,00 | 1 731,00 |
| 80 | 1358 | Станок координатно-расточной BKZ900x14* | 152 400,00 | 7 620,00 |
| 81 | 1535 | Тележка передаточная гр. 5 т С4171.05 | 396,00 | 19,80 |
| 82 | 1630 | Консольный кран 0,40т | 2 160,00 | 108,00 |
| 83 | 1800 | Кран консольный к/к 0,50 т | 2 100,00 | 105,00 |
| 84 | 1898 | Кран консольный к/к 1,00 т | 2 220,00 | 111,00 |
| 85 | 2026 | Кран консольный к/к 1,00 т | 2 220,00 | 111,00 |
| 86 | 2128 | Кран консольный к/к 1,00 т | 2 220,00 | 111,00 |
| 87 | 2293 | Кран консольный к/к 0,63 т | 3 360,00 | 168,00 |
| 88 | 2295 | Станок координатно-сверлильный с ЧПУ VR-5М-2295 | 429 600,00 | 21 480,00 |
